

НЕБА. ВЕРТАЛЁТ. ДЗЯЎЧЫНА

ЧЫРВОНКА

БРУД АДМЫЕЦЦА — ЭМОЦЫІ ЗАСТАНУЦЦА

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЖНІЎНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 151 (29265)


## ЦЫТАТА ДНЯ

**Са Звароту членаў Рэспубліканскага Савета ветэранаў да грамадзян Беларусі:**

*«Мы заклікаем звярнуць увагу маладога пакалення беларусаў на неабходнасць цаніць тое, што яны маюць, не паддавацца на заклікі да разбурэння таго, што створана вялікай працай старэйшага пакалення, працягнуць развіццё нашай краіны дзеля светлай будучыні. Няхай наш жыццёвы шлях, досвед і мудрасць стануць для нашых нашчадкаў арыенцірам, нагодай спыніцца і задумацца пра сапраўдныя каштоўнасці — магчымасць прымаць рашэнне аб уласным лёсе без уплыву звонку, мірна жыць, працаваць, развівацца, гадаваць новае пакаленне ў сваёй незалежнай, мірнай краіне».*

# Падарожжа на «Мальдывы»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Пра мелавыя кар'еры ў Ваўкавыскім раёне Гродзеншчыны, якія называюць няйначай як беларускія Мальдывы, ведаюць многія жыхары нашай краіны. Але, аказваецца, падобная экзотыка ёсць у нас і на ўскрайку Палесся, у Любанскім раёне. У летнія дні многія не толькі мясцовыя жыхары, але і прыезджыя са Старадарожскага, Слуцкага, Бабруйскага раёнаў і нават з Мінска спяшаюцца адпачыць на берагах кар'ераў, колер вады ў якіх бірузовы, бы на тых далёкіх цёплых астравах.

## КОРАТКА

- **Рэспубліканскі педсавет пройдзе ў жніўні ў Пінску.**
- «Беларуськалій» у ліпені абнавіў рэкорды па здабычы руды і выпуску ўгнаенняў.
- **Абноўлены памятны знак ахвярам Халакосту адкрыты ў Дуброўне.**



- У раёне пятага форта пад Брэстам выявілі боепрыпасы, якія праляжалі ў зямлі некалькі дзесяцігоддзяў .



- **Беларусь у жніўні закупіць 1,21 мільёна тон расійскай нафты.**
- Беларускіх аптэкараў пачалі страхаваць ад COVID-19.
- **Спартсменкі «Мінска» сталі ўладальніцамі Кубка Беларусі па хакеі на траве.**


ISSN 1990 - 763X

20151


Па палічках

## Дзесяць пытанняў пра крэдыты,

або Што трэба ведаць аб крэдыце, каб ён стаў сродкам рэалізацыі мэт, а не цяжарам на плячах

**Пра што абавязкова трэба падумаць перад тым, як браць на сябе фінансавыя абавязацельствы перад банкам? Як ацаніць свае магчымасці? І ў якім выпадку ў крэдыце вам адмовяць? Па адказы на гэтыя і іншыя пытанні мы звярнуліся да начальніка аддзела фінансавай адукаванасці ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Юліі САКОВІЧ.**

***— Як чалавеку ацаніць, ці разумна для яго ў тых ці іншых абставінах браць крэдыт?***

— У якім выпадку вы б ні вырашылі скарыстацца крэдытам, трэба добра ўсведамляць: яго неабходна вяртаць строга ў адпаведнасці з умовамі крэдытнага дагавора, а таксама выплаціць банку працэнты за карыстанне крэдытнымі грашыма. Таму вельмі важна рэальна ацаніць, наколькі стабільныя вашы даходы і ці зможаце вы своечасова і ў поўнай меры ажыццяўляць плацяжы па крэдытным дагаворы. Падумайце і крытычна ацаніце неабходнасць звароту па крэдыт. Пажадана, каб ён браўся на сапраўды неадкладныя і абгрунтаваныя мэты.




СТАР. 4

Выбары-2020

## КАБ БЫЎ МІР. УСЁ АСТАТНЯЕ ЁСЦЬ

Справы па гаспадарцы не перашкаджаюць датэрміноваму галасаванню

**У першы дзень датэрміновага галасавання па выбарах Прэзідэнта Беларусі на выбарчым участку № 23, які знаходзіцца ў будынку Пакалюбіцкага дома культуры, што ў Гомельскім раёне, свае галасы аддалі 26 выбаршчыкаў.**

Увогуле на ўчастак для галасавання ў Пакалюбічах **могуць прыйсці 2893 чалавекі. Менавіта столькі прозвішчаў значыцца ў спісах участковай камісіі.**

З моманту адкрыцця выбарчага ўчастка на другі дзень датэрміновага галасавання ў залу, дзе арганізаваны працэс выбараў, стабільна заходзяць выбаршчыкі. Сталыя людзі — пераважна ў медыцынскіх масках. Некаторыя карыстаюцца дэзынфектарамі на ўваходзе. Дарэчы, у кабінках для галасавання час ад часу праводзіцца санітарная апрацоўка паверхняў. Члены ўчастковай камісіі таксама ў медыцынскіх масках.

Нягледзячы на тое, што даводзіцца камунікаваць «праз павязку», тыя, хто прагаласаваў і выканаў грамадскі абавязак, пакідаюць участак у добрым настроі.

— Галасаваць хаджу заўсёды. Гэта наш абавязак, я так лічу, — тлумачыць уласную матывацыю жыхарка аграгарадка Пакалюбічы Любоў Скамарохава.

Жанчына адзначае, што яе задавальняюць арганізацыя і ўмовы, якія створаны для выбаршчыкаў на ўчастках для галасавання.

СТАР. 2

# НЕ ПРОСТА СУСЕДЗІ

**Учарашні дзень Прэзідэнта Беларусі быў прысвечаны ўкраінскай тэматыцы: адбыліся тэлефонная размова з калегам Уладзімірам Зяленскім і амаль трохгадзіннае інтэрв'ю журналісту і заснавальніку грамадска-палітычнага інтэрнэт-выдання «ГОРДОН» (Gordonua.com) Дзмітрыю Гардону.**

Лідары дзвюх краін абмеркавалі развіццё двухбаковых адносін, падрыхтоўку правядзення гэтай восенню ў Гродне III Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта Беларусі. Адзначана неабходнасць прыкласці максімум намаганняў для таго, каб гэтае мерапрыемства дало значныя практычныя вынікі, паслужыла актывізацыі супрацоўніцтва.

Таксама Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Зяленскі размаўлялі пра эпідэміялагічную сітуацыю ў краінах, меры па барацьбе з распаўсюджваннем каранавіруса, абмяняліся назапашаным у гэтым плане вопытам.

Абмяркоўваліся таксама пытанні ўзмацнення пагранічнага кантролю на беларуска-ўкраінскай граніцы і актывізацыі ўзаемадзеяння паміж пагранічнымі ведамствамі.

Уладзімір Зяленскі закрануў пытанне аб затрыманых у Беларусі баевіках. Ён паведаміў, што яны ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях на Данбасе і ўкраінская пракуратура вядзе расследаванне па адпаведных фактах. Аляксандр Лукашэнка, у сваю чаргу, адзначыў, што праваахоўныя органы будуць супрацоўнічаць па гэтым пытанні ў рамках падпісаных з Расіяй і Украінай міжнародных пагадненняў.

* * *

Некаторыя з гэтых тэм гучалі і падчас інтэрв'ю ўкраінскаму журналісту Дзмітрыю Гардону. Акрамя таго, размова ішла пра ўзаемаадносіны з былымі і дзеючымі кіраўнікамі дзяржаў, знешнюю палітыку нашай краіны, выбары і асабістае жыццё Прэзідэнта Беларусі.

Пра сутнасць сваёй палітыкі — як унутраной, так і знешняй — Аляксандр Лукашэнка сказаў наступнае: «Калі гэта датычыцца краіны, калі я бачу, што гэта несправядліва, для мяне гэта непрымальна. Справядлівасць — гэта аснова таго, што я спрабую рабіць, або праводзення любой палітыкі. У аснове — справядлівасць».

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што законы — гэта добра, але ў іх часам усё не прапішаш. «Справядлівасць — гэта галоўнае. Калі я бачу, што спрабуюць нахіліць маіх людзей, мой народ, Беларусь — гэта ўсё», — падкрэсліў беларускі лідар

Потым Дзмітрый Гардон падзяліўся ўражаннямі з беларускімі калегамі. Ён сказаў, што атрымалася чалавечае інтэрв'ю — абсалютна нефармальная, шчырая гутарка пра лёсы Беларусі, Украіны і ўвогуле чалавецтва.

«І мне здалося, што размова надзвычай цікавая, прыцягальная. Я ўбачыў жывога чалавека перад сабой, з якім вельмі цікава размаўляць. Чалавека, які застаў многіх славутых сусветных лідараў, вёў з імі перагаворы, размаўляў з імі, быў сведкам шматлікіх геапалітычных падзей і мае свой погляд на шэраг пытанняў сучаснасці», — сказаў журналіст.

Аўтарскі стыль Дзмітрыя Гардона — правакуючыя, вострыя пытанні. Сваю тактыку ён апрабаваў і на Аляксандру Лукашэнку. Беларускія журналісты пацікавіліся, наколькі гэта ўдалося.

«Лакіровачныя» размовы — гэта не мая гісторыя. Мне цікавая шчырая гутарка з чалавекам. Я зрабіў больш за тысячу відэаразмоў з людзьмі, якія сталі сімваламі часу і сімваламі эпохі, — палітыкамі, артыстамі, касманаўтамі і гэтак далей. Мне была цікавая размова вочы ў вочы, і я вельмі рад, што так адбылося. Я задаволены вынікам», — адзначыў Дзмітрый Гардон.

Ён лічыць: «Тое, што адбываецца ў Беларусі, вельмі важна для Украіны». «Украіна знаходзіцца ў тым стане, калі ў нас няма дагэтуль тэрытарыяльнай цэласнасці, яна не адноўлена», — кажа журналіст. Па словах Дзмітрыя Гардона, Прэзідэнт Беларусі «вельмі шчыра, паслядоўна» адказваў на пытанні — «я б сказаў, сенсацыйна адказваў, таму што такога ад яго я яшчэ не чуў».

«Гэта мастадонт, — сказаў пра субяседніка журналіст. — Гэта чалавек, які 26 гадоў кіруе дзяржавай у цэнтры Еўропы. Няма ніводнага чалавека сёння ў Еўропе, хто кіраваў бы дзяржавай больш за яго. Гэта ўжо красамоўна кажа пра тое, што гэта палітык сусветнага маштабу».

Тэлеверсію інтэрв'ю можна будзе ўбачыць на беларускім тэлебачанні.

Па звестках Украінскай інтэрнэт-асацыяцыі, праект «ГОРДОН» уваходзіць у топ-15 навінавых СМІ Украіны. Акрамя таго, агульная колькасць падпісчыкаў YouTube-каналаў яго заснавальніка («Дмитрий Гордон», «В гостях у Дмитрия Гордона») перавышае 2,2 мільёна.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Марыя ДАДАЛКА.**

Меркаванні

# «Беларусь заўсёды ўмела канцэнтравацца на галоўным і важным»

**Прадстаўнікі парламента і дзяржаўныя служачыя працягваюць дзяліцца сваімі ўражаннямі ад Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу.**



**Лілія АНАНІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі,** адзначае, што Пасланне лёсавызначальнае для нашага народа, бо сёння мы ўвайшлі ў завяршальную фазу выбарчай кампаніі, і перад кожным грамадзянінам стаіць важны выбар.

«Прэзідэнт эмацыянальна, глыбока, як сын свайго народа, звярнуўся да нас, беларусаў, з вельмі важнымі словамі. Мы шмат зрабілі для нашай краіны за 25 гадоў тварэння ў няпростых эканамічных, геапалітычных умовах, умовах санкцый. Сёння свет знаходзіцца на вельмі глыбокім разломе, і ад таго, які выбар зробяць беларусы (на карысць стабільнасці, далейшага эвалюцыйнага развіцця), мы зможам утрымаць нашу краіну ці паплывём па волі бушуючых хваль», — дадала яна.

Дэпутат падкрэсліла, што Прэзідэнт прапаноўвае рэальную праграму, грунтуючыся на тым, чаго дасягнулі ў эканоміцы і сацыяльнай сферы.

«Я згодна з Прэзідэнтам, што сёння ў розных кутках свету, асабліва на постсавецкай прасторы, на нас глядзяць з надзеяй і пытаннем: ці вытрымаюць беларусы, ці ўстаяць пад націскам сцэнарыяў «каляровых» рэвалюцый, якія «намаляваны» не ў нас, але ўсю іх магутнасць (тэхналагічную, фінансавую) мы ўжо на сабе адчуваем?» — канстатуе яна.

Па словах Ліліі Ананіч, асабіста для яе важна, каб краіна і далей заставалася месцам, дзе ўтульна жыць кожнай сям'і, існуюць справядлівасць, бяспека, высокі запыт на развіццё. Імпануюць ёй і словы кіраўніка краіны, звернутыя да моладзі, і тое, што будзе ўдзяляцца ўвага развіццю рэгіёнаў — кожная частка Беларусі заслугоўвае ўтульнага жыцця.

«Важны заклік і пасыл Прэзідэнта задумацца, што ў кожнага з нас у руках выбар лёсу не толькі сваёй сям'і, дома, але і сваёй Айчыны. Беларусь заўсёды ўмела канцэнтравацца на галоўным і важным. Я ўпэўнена, што беларусы зробяць правільны, лёсавызначальны выбар», — рэзюмавала Лідзія Ананіч.



**Леанід БРЫЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы,** расказаў, што разумее словы, сказаныя Прэзідэнтам наконт росту эканомікі ў будучым, — для гэтага ёсць магчымасці.

«Для таго каб наша эканоміка прырастала, нам неабходна не толькі захаваць экспартаарыентаванасць, але каб рынкі яшчэ і павялічваліся. Прагнозы ўрадждаю на гэты год паказваюць, што мы дастаткова сябе забяспечваем харчаваннем і маем магчымасць яго перапрацаваць для дабаўленай вартасці, адправіць на экспарт», — працягвае парламентарый.

У гэтым Леанід Брыч бачыць магчымасць атрымаць дадатковы валавы ўнутраны прадукт.

«Наша камісія датычная да распрацоўкі праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на найбліжэйшыя гады. Зыходзячы з той сітуацыі, якая склалася ва ўмовах пандэміі і сусветнага крызісу, я абсалютна падтрымліваю пазіцыю, што ў нас не ўводзіліся каранцінныя меры. У сувязі з гэтым наша эканоміка не ўпала вельмі моцна, толькі на 1,7 працэнта. У канцы года мы мяркуем выйсці на леташнія параметры», — упэўнены старшыня Пастаяннай камісіі.

## ШЛЯХАМ ЭВАЛЮЦЫІ



«Пасланне мяне ўразіла, гэта было эмацыянальна насычана. Ведаеце, урачы сутыкаюцца ў размове з пацыентамі і іх сваякамі з тым, што людзі ўспрымаюць рэчы, якія маюць, як нешта зразумелае. Ну падумаеш, бясплатная ахова здароўя, адукацыя, падумаеш, можна спакойна вечарам выйсці на вуліцу — так і павінна быць. Але, паглядзеўшы на свет, ты разумееш, што так не ўсюды. Людзі, шануйце тое, што ёсць. Толькі абапіраючыся дзвюма нагамі на падмурак, можна рухацца ў будучыню. Эвалюцыйны шлях развіцця заўсёды больш эфектыўны і прыносіць менш страт», — упэўнены **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК.**

Таксама ён падкрэсліў, што медыцыне ў краіне заўсёды ўдзялялася пільная ўвага: пабудавалі шмат новых устаноў, захавалі і развілі санітарную службу, інфекцыйныя стацыянары. Такі падыход да аховы здароўя дазволіў Беларусі выбраць свой шлях у барацьбе з каранавірусам.

«Нам не давялося рабіць страшны выбар: каго ратаваць — людзей або эканоміку. Кожны займаўся сваёй справай. Сапраўды былі нейкія праблемы, гэта ні для кога не сакрэт. На гэтыя праблемы звярнуў увагу і Прэзідэнт. З яго падтрымкай, я думаю, будзем больш аператыўна выпраўляць тое, што выявіла пандэмія, і зробім нашу сістэму аховы здароўя кампактнай, сучаснай, з высокім мабілізацыйным патэнцыялам», — сказаў Уладзімір Каранік.

## БЕЗ УМЯШАННЯЎ НЕ АБЫХОДЗІЛАСЯ



У пацвярджэнне тэмы «каляровых» рэвалюцый, якая прагучала ў Пасланні Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу, **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Андрэй РАЎКОЎ** адзначыў, што пачынаючы з 1994 года ніводная значная выбарчая кампанія ў Беларусі не абыходзілася без знешняга ўмяшання.

«Найноўшая гісторыя нашай краіны памятае як мінімум шэсць спроб «каляровых» рэвалюцый, — напісаў на сваёй старонцы ў Facebook Андрэй Раўкоў. — Гэтыя спробы робяцца пры дапамозе вонкава непалітызаваных структур і ў цяперашні час. Падобныя працэсы працягваюцца, хоць часам у больш удасканаленых, нярэдка закамуфляваных формах. Адна з іх, так званая трансфармацыя, прадугледжвае кардынальнае дэманціраванне суверэнітэту Беларусі праз змяненне грамадскай свядомасці, каштоўнаснай базы насельніцтва і дыскрэдытацыю органаў дзяржаўнага кіравання. А асноўнымі драйверамі ў гэтым павінны быць вонкава непалітызаваныя структуры, недзяржаўныя СМІ, блогасфера і сацыяльныя сеткі. Вядома, сучаснае жыццё немагчымае без гэтых атрыбутаў, аднак іх выкарыстанне менавіта для масавага прамывання мазгоў ператваралася ў выразны фактар канфліктаў і сацыяльных узрушэнняў XXI стагоддзя. Выражуся вобразна — нас ужо рыхтуюць да аперацыі, але наркоз яшчэ не надышоў. Нельга на гэта паддавацца».

**Марыя ДАДАЛКА і паводле БелТА.**

# КАБ БЫЎ МІР. УСЁ АСТАТНЯЕ ЁСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Прыйшла сюды з выдатным настроем, — кажа яшчэ адна жыхарка Пакалюбіч Валянціна Іванаўна. — Паднялася сёння і думаю: трэба хутчэй прагаласаваць, а то, можа, потым справы якія па гаспадарцы зацягнуць. Я за тое, каб у свеце быў мір. Усё астатняе ў нас ёсць. Шчыра думаю, што жывём мы добра.

**Старшыня ўчастковай выбарчай камісіі Любоў СІВУХА** расказвае, што **на ўчастку № 23 Гомельскай сельскай выбарчай акругі № 37 упершыню будуць галасаваць** 17 юнакоў і дзяўчат, якім нядаўна споўнілася 18 гадоў.

Дарэчы, у першы дзень датэрміновага галасавання па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на ўчастку № 18, размешчаным у сярэдняй школе № 22 Гомеля, правялі акцыю «Упершыню галасуючы».

— Я лічу, вельмі важна ўзяць удзел у такой значнай для ўсёй краіны падзеі, — падзялілася меркаваннем студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры Настасся Задруцкая. — У наступныя пяць гадоў хочацца бачыць нашу Беларусь мірнай, чыстай і, вядома ж, квітнеючай.

Між тым у першы дзень датэрміновага галасавання на ўчастак для галасавання № 23 Цэнтральнага раёна Гомеля, размешчаны на базе Гомельскага гарадскога цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, на працягу першай гадзіны прыйшло больш за дзесяць выбаршчыкаў.

Напрыклад, гамяльчанка Ганна Бабенышава адзначыла, што галасуе за спакойнае, добрае і нармальнае жыццё, каб у будучыні яно стала яшчэ лепшым. А Алена



Дударава паведаміла, што яе выбар — курс на стабільнасць і росквіт.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

Бяспека

# НЕ ТРАПІЦЬ У РАБСТВА АНЛАЙН



## Як у краіне змагаюцца з гандлем людзьмі

**Споўнілася дваццаць гадоў з таго моманту, як былі прыняты Канвенцыя ААН супраць транснацыянальнай арганізаванай злачыннасці і Пратакол аб прадухіленні і спыненні гандлю людзьмі. Абодва дакументы ратыфікаваны Беларуссю. Для нашай краіны супрацьстаянне гэтым трансгранічным злачынствам асабліва актуальна, і не ў апошнюю чаргу праз яе транзітны статус.**

Па статыстыцы Міністэрства ўнутраных спраў, з 2000 года ў Беларусі выяўлена 4421 злачынства, звязанае з гандлем людзьмі. Былі ліквідаваны 22 злачынныя арганізацыі і 85 арганізаваных груп, якія працавалі на гэтай «ніве». Праваахоўнікі таксама перакрылі 727 каналаў пастаўкі людзей праз граніцу. Усё гэта дазволіла нанесці істотны ўдар сістэме гандлю «жывым таварам». Але казаць пра поўную перамогу пакуль не выпадае.

— Гэта добра наладжаны транснацыянальны від злачыннай дзейнасці, які прыносіць каласальныя даходы, супастаўныя з прыбыткам ад гандлю зброяй і наркотыкамі, — расказвае **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС Дзмітрый ЦАЮН.** — Але наша работа дазволіла істотна скараціць маштабы гандлю людзьмі і ўзяць сітуацыю пад кантроль. Мы змагаемся не толькі на лакальным, але і на міжнародным узроўні. Краіна ўваходзіць ва ўсе сусветныя дагаворы па гэтай тэме, а таксама актыўна падтрымлівае ўсе ініцыятывы, скіраваныя супраць гандлю людзьмі.

Сёння пераважна выяўляюцца злачынствы, звязаныя з так званым «чыстым» гандлем людзьмі. У асноўным гэта прастытуцыя, выкарыстанне дзяцей ў парнаграфічных здымках. Практыка паказала, што ўзрастаюць новыя выклікі і пагрозы ў сферы незаконнай эксплуатацыі людзей. Яна паступова перацякае ў інтэрнэт. Сучасныя трафікёры рэалізуюць увесь ланцужок, не выходзячы з дому, а выкарыстоўваючы сецiва. Асаблівую трывогу выклікаюць злачынствы, звязаныя з сексуальным гвалтам у дачыненні да дзяцей. Магчымасць выдаваць сябе за каго заўгодна дазваляе педафілам лёгка ўваходзіць у завочны кантакт з малымі. Нярэдка гэта перацякае ў падрыхтоўку да рэальнай сустрэчы.

Толькі сёлета ў Беларусі было выяўлена 55 злачынстваў, звязаных з гандлем людзьмі. 30 з іх адносяцца да цяжкіх і асабліва цяжкіх. Перакрыты 10 каналаў вывазу нашых грамадзян за мяжу для эксплуатацыі. Высветлены асобы больш чым 70 пацярпелых, прычым пятая частка з іх — непаўналетнія.

Таму ў Беларусі стартаваў другі этап інфармацыйнай кампаніі «Навучыце дзяцей бачыць хлусню». Ён пройдзе ў сацыяльных сетках. Яго мэта — распаўсюдзіць інфармацыю аб праблеме сексуальнага гвалту і эксплуатацыі непаўналетніх, у тым ліку ўцягнення ў выраб парнаграфіі. Праект разлічаны на бацькоў і спецыялістаў, якія працуюць з дзецьмі. Азнаёміцца з падрабязнасцямі кампаніі можна на сайце smartparent.by. Праект рэалізуецца сумесна з МУС Беларусі, МАМ, USAID і МЗС Нарвегіі.

Даўні партнёр Беларусі ў супрацьдзеянні гандлю людзьмі — Злучаныя Штаты Амерыкі. На гэта звярнуў увагу часовы паверaны ў справах ЗША ў Беларусі Джэфры Джук.

— Мы сумесна дасягнулі вялікага прагрэсу, але шмат чаго яшчэ належыць зрабіць. Гандаль людзьмі — праблема глабальная, якая закранае ўсе краіны свету. Мы вітаем заклапочанасць урада Беларусі, ААН, МАМ і іншых арганізацый па абароне людзей. Хачу падзякаваць Беларусі за доўгатэрміновае і прадукцыйнае супрацоўніцтва на такіх сусветных пляцоўках.

Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (USAID) працягвае аказваць падтрымку Беларусі ў супрацьдзеянні гандлю людзьмі. Больш за 10 тысяч чалавек з груп рызыкі атрымалі ўсю інфармацыю пра патэнцыйную небяспеку, якая ім пагражае. Сотні чалавек прайшлі праз рэабілітацыю і рэінтэграцыю. Акрамя таго, была створана бясплатная гарачая тэлефонная лінія і запушчаны анлайн-кансультацыі. Дзякуючы ім можна даведацца пра бяспечны выезд у 144 краіны свету. Лік званотаў ідзе на тысячы.

За акрэсленымі вышэй лічбамі стаяць чалавечыя лёсы. І паўстае пытанне, як жа дапамагчы людзям, якія ледзь не трапілі ў рабства.

— Пры падтрымцы донараў мы аказалі за 18 гадоў дапамогу амаль чатыром тысячам чалавек, якія пацярпелі ад гандлю людзьмі, — адзначыла старшыня прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Беларусі Махым Аразмухамедава. — Сёння ў фокусе міжнароднай увагі — тыя, хто працуе на перадавой, гэта значыць ідэнтыфікуе пацярпелых і змагаецца за іх правы. Роля гэтых спецыялістаў узрастае шматразова ва ўмовах пандэміі каранавіруса.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ГЕНЕТЫЧНЫ КОД

## Разгадаць яго дапамогуць эксперты

**Ці ведалі вы, што ДНК чалавека можа расказаць пра многае? Напрыклад, пра індывідуальную адчувальнасць да лекавых прэпаратаў, схільнасць да развіцця розных захворванняў, спартыўныя перспектывы, нават пра псіхаэмацыянальныя асаблівасці. І гэты спіс можна працягваць доўга. Загадчыца лабараторыі генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Ірма МАСЭ адзначае, што на сёння самая запатрабаваная паслуга сярод кліентаў — гэта дыягностыка па выяўленні генетычных прычын невыношвання цяжарнасці.**

— Нашы супрацоўнікі даследуюць 24 гены, ад якіх можа залежаць яе нармальнае працяканне. На сёння 50 працэнтаў тых, у каго ёсць праблемы з зачаццем дзіцяці, пасля атрымання вынікаў даследавання, з дапамогай медыкаў выпраўляюць праблему. Мы выкарыстоўваем унікальныя тэхналагічныя прыёмы, якія дазваляюць зрабіць таннейшай гэтую методыку, і думаем пра тое, каб яна была даступная для ўсіх.

Як дазналіся ў спецыялістаў, на сёння многіх цікавіць пытанне даўгалецця. **Вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі экалагічнай генетыкі і біятэхналогіі Інстытута генетыкі і цыталогіі Алена МІХАЛЕНКА** расказала, што вучоныя Беларусі і Сардзініі зараз праводзяць сумесныя даследаванні ў гэтай галіне. Аднак асноўная задача на цяперашні момант заключаецца ў паляпшэнні якасці жыцця, а не ў павелічэнні яго працягласці. Таксама папулярная дыягностыка ў лабараторыі — па нутрыгенетыцы: многія хочуць высветліць, ці ёсць у іх адчувальнасць да малочных прадуктаў. Да таго ж ёсць вялікая цікавасць да дыягностыкі па дэфіцыце вітамінаў.

Што дапамагае сёння спецыялістам праводзіць розныя генетычныя даследаванні ў хуткім рэжыме? Сучаснае абсталяванне і інфармацыйныя тэхналогіі. Напрыклад, чалавеку спатрэбілася б каля васьмі гадзін, каб правесці пэўную дыягностыку, прыбор жа робіць гэта за паўтары гадзіны. Адзін запуск дазваляе «счытаць» больш за чатыры тысячы генаў для 34 чалавек. А задача спецыялістаў заключаецца ў тым, каб гэты аб'ём даных апрацаваць пры дапамозе пэўнага алгарытму.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сталіца Лівана пасля выбуху ў порце можа застацца без харчавання



У выніку двух выбухаў у порце сталіцы Лівана Бейрута загінула прынамсі 100 чалавек, больш за 4 тысячы атрымалі раненні, некалькі кварталаў горада цалкам разбураныя. Згодна з заявамі ўлад, выбухнула вялікая партыя нітрату амонію (таксама вядомага як аміячная салетра), які доўгі час захоўваўся ў порце без выканання мер бяспекі.

Выбуховая хваля разбурыла мноства будынкаў, у тым ліку размешчаных на адлегласці некалькіх кіламетраў ад порта, і раскідала аўтамабілі. Выбух быў настолькі моцны, што яго чулі на міжземнаморскім востраве Кіпр, які знаходзіцца на адлегласці 240 кіламетраў ад Бейрута, паведамляе ВВС.

На ўчарашні дзень ратавальнікі працягвалі пошукі больш чым ста чалавек, чый лёс невядомы. Некаторыя работнікі порта ў выніку выбуху былі выкінуты ў мора.

Катастрофа таксама выклікала апасенні харчовага крызісу — Ліван імпартуе большую частку прадуктаў, і значныя запасы збожжа захоўваліся на складах у разбураным выбухам порце. Міністр эканомікі Лівана ўжо заявіў, што партыя збожжа, якая засталася на партовых складах, непрыдатная для яды.

**«З вялікім болем у Беларусі ўспрынялі сумную вестку пра шматлікія ахвяры трагічнага здарэння ў порце Бейрута», — гаворыцца ў спачуванні, якое Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад сябе і ад імя беларускага народа накіраваў Прэзідэнту Лівана Мішэлю Ауну.**

### Берлінскіх школьнікаў абавязалі насіць ахоўныя маскі на ўроках



У школах Германіі пачаўся новы навучальны год. Дэпартамент сената сталіцы ФРГ па адукацыі, справах моладзі і сям'і разаслаў бацькам вучняў ліст, які апынуўся ў распараджэнні РІА Навіны. «Ва ўсіх школах, уключаючы ўрокі і ажыццяўленне дадатковага нагляду, дзейнічае абавязковае правіла насіць ахоўную маску, якая закрывае нос і рот, у закрытых памяшканнях. Гэта абавязацельства не распаўсюджваецца на людзей, якія не могуць прыкрываць рот і нос з-за стану здароўя. У школьных дварах або падчас работы на адкрытым паветры неабходнасці ў ахоўнай масцы няма», — гаворыцца ў пісьме.

У дакуменце ўказваецца, што пры наведванні школы «бацькі і любыя старонія людзі заўсёды павінны насіць ахоўную маску, якая закрывае рот і нос».

Як заявіў раней кіраўнік інстытута мікрабіялогіі і вірусалогіі пры інстытуце медыцыны Брандэнбурга прафесар Франк Т. Хуферт, Германія ўжо знаходзіцца ў пачатку другой хвалі каранавіруса, і аднаўленне школьных заняткаў у жніўні яшчэ больш ускладняе эпідэміялагічную сітуацыю.

### Маракоў выратавалі дзякуючы надпісу «SOS» на пяску



Трох маракоў знайшлі на незаселеным востраве ў Мікранезіі дзякуючы велізарнаму надпісу «SOS» на пяску. 30 ліпеня маракі адплылі ад атола Пулуват на сяміметровай лодцы. Яны планавалі пераадолець 43 кіламетры да атола Пулап (Мікранезія), але ў дарозе збіліся з курсу і растрацілі ўсё паліва, адзначае Associated Press.

Мясцовыя ратавальнікі папрасілі дапамогі ў Аўстраліі. Да пошукаў далучыўся дэсантны карабель «Канбера», які вяртаўся з вучэнняў у штаце Гаваі. 2 жніўня, праз тры дні пасля іх знікнення, аўстралійскія вайскоўцы заўважылі на беразе вострава надпіс «SOS». Маракі знаходзіліся за 190 кіламетраў ад атола Пулуват.

Ваенны верталёт даставіў падарожнікам ежу і ваду. Са слоў ратавальнікаў, маракі жывыя і здаровыя. У хуткім часе іх забярэ мікранезійскі патрульны карабель.

Меркаванне

# «Айчынныя фармацэўты імкнуцца да імпартазамяшчэння лекавых сродкаў»



**Валянціна КУГАЧ, начальнік вучэбна-навуковай вытворчасці «Фармацыя» Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта, расказала, што з сярэдзіны 1990-х гадоў фармацэўтычная галіна краіны не проста зрабіла крок наперад, а прайшла значны шлях у сваім станаўленні.**

«У краіне было два заводы, якія стваралі медыцынскія прэпараты, а стала больш за 40, было 105 найменняў лекавых сродкаў, якія выпрабляліся, сёння — больш за 1500. Мы сталі самі ствараць новыя лекавыя формы, якіх раней не было на нашым рынку, — капсулы, супазіторыі, спрэі. Цяпер працуем над тым, каб выпрабляць аэразолі. У гэтым плане мы паступова запаўняем нішу», — запэўнівае спецыяліст.

У краіне існуе пералік асноўных лекавых сродкаў — гэта своеасаблівы мінімальны спіс лекаў, неабходных для лячэння ўсіх хвароб. Айчынныя спецыялісты імкнуцца выпрабляць усе сродкі з гэтага спіса самастойна.

«Мне здаецца, што мы стварылі і заканадаўчую базу, якая забяспечвае такі механізм, каб у нас на рынку лекавыя прэпараты з'яўляліся як мага раней. Так, Прэзідэнтам 31 снежня 2019 года падпісаны Указ № 499 «Аб абароце лекавых сродкаў». Там гаворыцца пра спрашчэнне сістэмы іх рэгістрацыі», — расказвае Валянціна Кугач.

У новай рэдакцыі закона «Аб лекавых сродках» замацаваны працэдура ўмоўнай рэгістрацыі і больш ранні доступ лекавых сродкаў на рынак. Такія навацыі даюць хворым дадатковы шанц на выздараўленне.

**Запісала Марыя ДАДАЛКА.**

# Дзесяць пытанняў пра крэдыты...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

І, вядома, ні ў якім разе не прымайце рашэнне аб тым, каб узяць крэдыт, імпульсіўна. Складзіце поўнае ўяўленне пра той банкаўскі прадукт, якім вы хочаце скарыстацца, ацаніце дакладную суму платы за карыстанне грашыма і дакладны графік плацяжоў. Параўнайце падобныя прадукты ў розных банках, каб выбраць варыянт, які найбольш падыходзіць менавіта вам.

**«Крэдыт — гэта не падарунак, яго давядзецца вяртаць з працэнтамі, як бы ні склалася ў далейшым ваша жыццё. «Купляйце зараз, плаціце потым» — гэта выглядае прывабна. Але важна разумець, што тое «потым» абавязкова наступае».**

У якім выпадку браць крэдыт — разумнае рашэнне? Калі рэч магчыма набыць толькі ў крэдыт — тады, безумоўна, ён апраўданы. Напрыклад, цалкам зразумела, што для рэалізацыі такой важнай мэты, як набыццё кватэры, чалавеку, хутчэй за ўсё, спатрэбіцца фінансавая падтрымка з боку. Грошы таксама могуць спатрэбіцца на арганізацыю свайго бізнесу, на экстраннае лячэнне і г. д. Неапраўданым будзе крэдыт на тое, без чаго аб'ектыўна можна абысціся або на што можна сабраць самастойна праз некаторы час. У гэтым выпадку набыццё рэчы абыйдзецца танней, бо крэдыт — гэта не падарунак, яго давядзецца вяртаць з працэнтамі, як бы ні склалася ў далейшым ваша жыццё. «Купляйце зараз, плаціце потым» — гэта выглядае прывабна. Але важна разумець, што тое «потым» абавязкова наступае.

***— Як банк прымае рашэнне аб выдачы крэдыту?***

— Робіць ён гэта на падставе шматфактарнага аналізу: ацэньвае даходы кліента, яго магчымасці своечасова рэгулярна пагашаць крэдыт і выплачваць працэнты. Для гэтага, у прыватнасці, банк выкарыстоўвае інфармацыю з крэдытных гісторый, якія захоўваюцца ў Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь. Крэдытная гісторыя паказвае, якія крэдыты ёсць у чалавека цяпер, якія ён браў раней і як выконваў прынятыя на сябе абавязкі. Яна выдаецца банку ў выглядзе крэдытнай справаздачы са скорынгавай ацэнкай. Але крэдытная гісторыя не мае ні дазваляльнай, ні забараняльнай функцый. Банк можа спадзявацца на разлікі, зробленыя Нацыянальным банкам, або распрацаваць



уласныя крытэрыі ацэнкі крэдытаздольнасці заяўніка. Тое, што ў Нацыянальным банку вядуцца нейкія «чорныя спісы», трапіўшы ў якія, вы ўжо не зможаце разлічваць на крэдыт ні ў адным банку краіны, — гэта казкі.

***— А што такое скорынгавая ацэнка?***

— Гэта сістэма прысваення балаў, якая характарызуе здольнасць кліента пагасіць дадзены яму крэдыт. Балы разлічваюцца па спецыяльным алгарытме на падставе інфармацыі пра паводзіны крэдытаатрымальніка ў мінулым. На скорынгавую ацэнку ўплываюць такія фактары, як, напрыклад, колькасць дзеючых дагавораў па крэдытных здзелках (у тым ліку нядаўна заключаных), наяўнасць пратэрміновак выплат па вашых мінулых крэдытах, іх працягласць і сумы. Бал будзе ніжэйшы, калі ў вас «маладая» крэдытная гісторыя (банк ацэньвае час з моманту заключэння вашай першай крэдытнай здзелкі). Таксама ўплывае колькасць запытаў вашай крэдытнай гісторыі рознымі фінансавымі арганізацыямі: чым іх больш за кароткі час, тым ніжэйшы бал.

***— А ці можна ўбачыць сваю крэдытную гісторыю самому?***

— Азнаёміцца са сваёй крэдытнай гісторыяй вельмі карысна, каб ведаць, на што можна разлічваць, а таксама для праверкі, ці не закралася ў яе памылка. І гэта нескладана. Можна асабіста звярнуцца ў Нацыянальны банк з пашпартам і атрымаць крэдытную справаздачу. У Мінску такія звесткі выдаюць па адрасе вул. Талстога, 6 (там размешчаны Крэдытны рэгістр Нацыянальнага банка), у іншых населеных пунктах вашу крэдытную справаздачу дадуць у галоўных упраўленнях Нацбанка па абласцях. Можна атрымаць гэты дакумент і не выходзячы з дому, у электронным выглядзе, прайшоўшы рэгістрацыю ў міжбанкаўскай сістэме ідэнтыфікацыі (https: ipersonal.raschet.by). Раз на год крэдытная справаздача даецца бясплатна.

***— Як зразумець, якую максімальную суму грошай я магу атрымаць у крэдыт?***

— Выдаючы крэдыт на спажывецкія патрэбы, банк вызначае паказчык пазыковай нагрузкі. Ён разлічваецца як працэнтныя суадносіны агульнага памеру фінансавых абавязацельстваў, якія мае патэнцыйны крэдытаатрымальнік, да памеру яго сярэднямесячнага даходу. Паказчык пазыковай нагрузкі не павінен перавышаць 40 %.

Пры выдачы крэдыту на фінансаванне нерухомасці банк вызначае паказчык забяспечанасці крэдыту. Ён разлічваецца як працэнтныя суадносіны сумы крэдыту і кошту аб'екта нерухомасці, які прымаецца ў заклад у якасці забеспячэння, або іншага забеспячэння ў адпаведнасці з дагаворам. Паказчык забяспечанасці крэдыту не павінен быць большы за 90 %.

***— Што рабіць, калі крэдыт быў узяты раней, а цяпер грошай выплачваць яго няма? Напрыклад, чалавек узяў крэдыт і сур'ёзна захварэў або страціў работу і не можа выплачваць штомесячныя плацяжы па ім.***

— Калі крэдытаатрымальнік сутыкнуўся з цяжкасцямі пры пагашэнні крэдыту, у першую чаргу трэба звярнуцца ў банк пісьмова і паведаміць яму пра свае праблемы. Ёсць сэнс прасіць аб магчымай рэструктурызацыі крэдыту, заключэнні дадатковага пагаднення да крэдытнага дагавора, якое б прадугледжвала даванне банкам адтэрміноўкі па пагашэнні крэдыту, павелічэнне тэрміну крэдыту, зніжэнне працэнтнай стаўкі. Такім чынам, сумесна з банкам вы можаце знайсці ўзаемапрымальны варыянт выхаду з сітуацыі, якая склалася.

***— Калі чалавек з'яўляецца паручыцелем па крэдыце, ці будзе яму больш складана ўзяць крэдыт для сябе?***

— Так, трэба ўлічваць, што інфармацыя пра вашы абавязацельствы па крэдытным дагаворы ў якасці паручыцеля накіроўваецца ў Нацыянальны банк, дзе фарміруецца ваша крэдытная гісторыя. Пры разглядзе заявы на атрыманне крэдыту банк будзе ацэньваць вашу крэдытаздольнасць з улікам абавязацельстваў па дагаворы паручыцельства.

***— Калі чалавек хоча датэрмінова пагасіць спажывецкі крэдыт, ці можа банк прад'явіць штрафныя санкцыі?***

— Крэдыт, выдадзены фізічнай асобе на спажывецкія патрэбы, можа быць датэрмінова пагашаны без папярэдняга паведамлення банку і выплаты штрафных санкцый. Такім чынам крэдытаатрымальнік у падобнай сітуацыі ажыццяўляе зварот сумы крэдыту ў парадку, які прадугледжаны крэдытным дагаворам, і выплачвае працэнты за фактычны час карыстання крэдытам.

***— А ці можа банк патрабаваць датэрміновага вяртання крэдыту?***

— Пры неналежным выкананні кліентам абавязацельстваў банк мае права патрабаваць датэрміновага вяртання крэдыту, папярэдне паведаміўшы яму пра гэта. Але ў крэдытным дагаворы абавязкова павінна быць замацавана права крэдытаатрымальніка вярнуць крэдыт на працягу трох месяцаў з дня атрымання адпаведнага паведамлення ад банка.

***— Ці можна паставіць члену сям'і ў крэдытную гісторыю пазнаку, каб яму не давалі крэдыты, бо ён п'е, псіхічна нездаровы і г. д.?***

— Крэдытная гісторыя — гэта толькі сухія лічбы і факты: ніякіх забарон на крэдытаванне, пазнак, плюсікаў ці мінусікаў у ёй не праставіцца. Грамадзянін можа быць прызнаны недзеяздольным або абмежавана дзеяздольным у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам. А Нацыянальны банк не можа нікога абмяжоўваць у яго правах.

На 1 ліпеня 2020 года запазычанасць жыхароў краіны па банкаўскіх крэдытах склала 15 мільярдаў рублёў, у тым ліку па крэдытах на спажывецкія патрэбы — 5,7 мільярда і па крэдытах на будаўніцтва (рэканструкцыю) і набыццё жылля — 9,3 мільярда.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ВЕЛАСІПЕД УКРАЛА... БАБУЛЯ

**У аператыўна-дзяжурную службу Барысаўскага РУУС звярнуўся 20-гадовы мясцовы жыхар з паведамленнем аб крадзяжы веласіпеда. Шкоду заяўнік ацаніў у 200 рублёў.**

Хлопец расказаў, што пакінуў транспарт каля бетоннай агароджы па праспекце Рэвалюцыі. Вярнуўшыся па яго пасля рабочага дня, на ранейшым месцы двухколавую машыну не знайшоў. Па словах пацярпелага, бестурботнасць ён не праяўляў: веласіпед да агароджы быў прымацаваны з дапамогай троса з кодавым замком.

На месца здарэння выбылі супрацоўнікі міліцыі і па гарачых слядах устанавілі, што крадзеж здзейсніла 71-гадовая барысаўчанка, якая жыве непадалёк. Выкрадзеную маёмасць пенсіянерка схавала ў падвале свайго дома.

Як растлумачыла жанчына, на злачынства яна пайшла спантанна, бо вырашыла, што веласіпед знаходзіўся ў «небяспечным» становішчы і яго мог хтосьці выкрасці, паведамляе УУС Мінскага аблвыканкама.

Следчым камітэтам распачата крымінальная справа па частцы 1 артыкула 205 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь («Крадзеж»).



## МАЦІ З 3,52 ПРАМІЛЕ ВЕЗЛА ТРАІХ ДЗЯЦЕЙ

**Падрабязнасці гэтай гісторыі паведамляе УУС Мінаблвыканкама.**

У аператыўна-дзяжурную службу Барысаўскага РУУС каля 20 гадзін паступіла паведамленне аб тым, што па вуліцы Зялёны Гарадок у Барысаве рухаецца аўтамабіль «Рэно Меган», кіроўца якога, верагодна, знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення.

Супрацоўнікі ДАІ Барысаўскага РУУС, прыбыўшы на названы адрас, заўважылі такую машыну. Яны падалі сігнал аб спыненні, кіроўца транспартнага сродку адразу ж яму падпарадкаваўся.

У ходзе разбору было ўстаноўлена, што за рулём знаходзілася 34-гадовая мясцовая жыхарка. Жанчына не мела права кіравання аўто і была ў стане алкагольнага ап'янення (3,52 праміле). Таксама ў машыне знаходзілася трое дзяцей: 11-гадовая і 4-гадовая дзяўчынкі былі ў аўтакрэслах, прышпіленыя рамянямі бяспекі, а вось 5-месячны сын знаходзіўся на руках у старэйшай дачкі.

Парушальніцу прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці па шэрагу артыкулаў КаАП. Дарэчы, жанчына раней ужо прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасці за кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення.

Дзяржаўтаінспекцыя Мінскай вобласці дзякуе грамадзянам, якія не засталіся абыякавымі і своечасова патэлефанавалі на лінію 102.

## ПАСЯЛІЎСЯ Ў ЧУЖЫМ ГАРАЖЫ

### І... распрадаваў адтуль маёмасць

**У аператыўна-дзяжурную службу Ленінскага РУУС Магілёва з заявай звярнуўся 88-гадовы жыхар горада, які расказаў, што невядомы чалавек на працягу ліпеня выносіў маёмасць з яго гаража, размешчанага ў адным з блокаў па вуліцы Крупскай.**

Пенсіянер пералічыў выкрадзенае за гэты час: рухавік з каробкай перадач, камплекты колаў, бампер ад аўтамабіля, металічныя вароты. Агульная сума нанесенай шкоды склала больш за 1870 рублёў, паведамляе УУС Магілёўскага аблвыканкама.

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Ленінскага РАУС па падазрэнні ў датычнасці да названых падзей затрымалі 52-гадовага жыхара горада, які нагледзеў чужы гараж для асабістых патрэб.

Мужчына зрэзаў два навясныя замкі і пасяліўся ўнутры памяшкання, якое яму не належала. Пасля, асмялеўшы, стаў запрашаць туды сваіх прыяцеляў, з якімі яны разам распівалі спіртныя напоі і заставаліся начаваць.

Калі праз тыдзень злачыннага правядзення часу ўладальнік гаража так і не з'явіўся, зламыснік стаў распрадаваць чужую маёмасць, а пасля нацэліўся на аўтамабіль, які стаяў там жа. Аднак ён паспеў толькі зняць з машыны рухавік — шакіраваны ўладальнік гаража ўсё ж такі прыйшоў і выявіў, у што ператварылася памяшканне. Ён адразу ж выклікаў праваахоўнікаў.

Удалося высветліць, што ў планах «захопніка» гаража быў нават яго продаж — на гэтай здзелцы ён таксама планаваў зарабіць грошы, якія пасля патраціў бы на спіртныя напоі.

Мужчына быў затрыманы, у дачыненні да яго распачата крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

6 ЖНІЎНЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 14 (15891)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

## ГАННА КАРАСЕВА:

# «КОНЬ І Я — АДЗІН СПАРТСМЕН З ДВУМА СЭРЦАМІ»



**Шматразовая чэмпіёнка Беларусі, пераможца Кубка свету, наезніца, якая заваявала для краіны чатыры залатыя медалі на турніры ўзроўню складанасці 4* з максімальных 5* у Расіі, Ганна Карасева расказала нам пра тонкасці работы з конямі, прыход у гэты від спорту і цяжкасці, якія ёй давялося пераадольваць на шляху да поспеху.**

— Любоў да коней была ў мяне з самага дзяцінства. Усе летнія канікулы я праводзіла ў вёсцы, там была ферма з гэтымі жывёламі. Мне падабалася хадзіць туды, карміць і гладзіць іх і, напэўна, пасля першага таго знаёмства прыйшло ўсведамленне, што я хачу трапіць у конны спорт. На жаль, мне давялося чакаць некаторы час да спаўнення мары, бо ў групы набіралі дзяцей з дзесяці гадоў, але я ўпарта верыла, і як толькі дасягнула падыходзячага ўзросту, адразу ж пайшла на заняткі, — прыгадвае суразмоўніца.

Нягледзячы на тое, што конны спорт дастаткова траўманебяспечны, бацькі заўсёды падтрымлівалі нашу гераіню і дапамагалі ва ўсіх яе пачынаннях.

— Тата — былы прафесійны спартсмен, таму ён вельмі добра паставіўся да майго імкнення. Мама таксама была за спорт. На яе думку, дзецям лепш хадзіць у якія-небудзь секцыі, чым тусавацца ў дварах і незразумела чым займацца. Бацькі ніколі не шантажавалі захапленнем, як гэта любяць рабіць некаторыя дарослыя. А яшчэ яны ніколі не назіралі за працэсам трэніровак, за што ім вялікі дзякуй. Я проста не пераношу, калі бацькі прыязджаюць на іх *(смяецца)*. Затое люблю паказваць ім гатовы вынік і бачыць, як тата з мамай ганарацца маімі дасягненнямі.

Наша гераіня расказала, што конны спорт — вельмі цяжкі. Чаго толькі каштавала наладзіць кантакт са сваім чатырохкапытным сябрам. Вага гэтай жывёлы можа дасягаць пяцісот кілаграмаў, з-за гэтага ім не лёгка кіраваць. А выконваць самастойна многія элементы на трэніроўках ён не заўсёды хоча, таму што жывёле гэта фізічна цяжка. І даводзіцца дамаўляцца: дзесьці праз сілу, недзе, наадварот, праз нейкія заахвочванні — цукар, яблычкі. Да таго ж коні — статкавыя жывёлы, і ў іх адпаведныя інстынкты: калі адзін бяжыць, другі таксама можа рвануць, пабегчы. Калі нават пакецік які-небудзь у манежы зашамаціць, конь ужо баіцца, і спыніць або супакоіць яго на хаду бывае часам проста нерэальна, што часта прыводзіць да сур'ёзных траўмаў. Напрыклад, можна прыгадаць выпадак з Інгрыд Клімке, нямецкай наезніцай, двухразовай алімпійскай чэмпіёнкай, чэмпіёнкай свету і Еўропы, якая выступала ў конным трохбор'і, прымала ўдзел у пяці Алімпійскіх гульнях з 2000 да 2016 года. Сёлета яна зламала сабе пазваночнік на спаборніцтвах...

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Свая вышыня

# НЕБА. ВЕРТАЛЁТ. ДЗЯЎЧЫНА

## І адно каханне на дваіх



**— Заўсёды хацелася сумясціць любімыя захапленні — палёты і медыцыну. І вось цяпер мара ажыццявілася, — расказвае дваццацітрохгадовая Анастасія БУРКО. — Мой першы палёт адбыўся ў родным Жлобіне, калі мне было пяць гадоў. У аэраклуб перыядычна браў з сабой бацька, катаў на планёры і на самалёце. Можна сказаць, што менавіта ён перадаў мне любоў да неба.**

Наша гераіня — майстар спорту, удзельніца XVI чэмпіянату свету па верталётным спорце. Амаль палову свайго жыцця Насця правяла на вышыні, гэта для яе захапленне нумар адзін. Другое звязана з прафесіяй, суразмоўніца — малады ўрач. Скончыла лячэбны факультэт Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і зараз працуе інтэрнам у бальніцы хуткай дапамогі ў Брэсце. Ці лёгка сумяшчаць гэтыя два заняткі?

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

І сабе, і людзям

# Вабіць іх ягада,

## або Бundefinedяковыя будні «Парачанкі»

**Студэнцкі сельскагаспадарчы атрад «Парачанка» імя Героя Савецкага Саюза Мікалая Ціханавіча Аўчыннікава Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта апошнія два гады прызнаваўся найлепшым у краіне ў сваёй намінацыі па выніках Усебеларускага злёту студэнцкіх атрадаў «Час руху». Яго ўдзельнікі на працягу некалькіх гадоў прыязджаюць у аграгарадок Парэчча Гродзенскага раёна, каб сабраць як можна больш ягад — буякоў. Студэнтка пятага курса факультэта ветэрынарнай медыцыны дваццаціадн агадовая Віталія СЕЛІВОНЧЫК не раз станавілася першай сярод іншых: як на пасадзе камісара атрада, так і камандзіра (двойчы). У дзяўчыны ўжо даўно не ўзнікае пытання, як правесці свае лета. Зразумела, працуючы.**

— На першым курсе было цікава паспрабаваць нешта новае і падзарабіць, такім чынам апынулася ў камандзе сэрвіснага студэнцкага атрада. Тады вяла экскурсіі ў агратурыстычным комплексе «Каробчыцы». А ўжо праз год абрала для сябе атрад «Парачанка». Калі паступіла прапанова заняць адказную пасаду камісара, а пасля камандзіра, ні хвіліны не разважала над адказам, — вельмі хацелася хутчэй прыступіць да работы, — расказала суразмоўніца.



Таццяна Урбановіч (злева) упершыню займаецца зборам ягад.

Сёлета ў камандзе атрада 13 студэнтаў з розных факультэтаў і курсаў: дзесяць дзяўчат і тры хлопцы. Працоўны семестр у іх доўжыцца да 30 жніўня. Байцы ўжо адпрацавалі амаль месяц, столькі ж і засталося.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

Бачыць мэту

## Як маладым знайсці сваё «месца пад сонцам»

# Працаўладкавацца, пакуль едзе ліфт...

**«Хадзіце на сумоўе з добрым настроем. Не зважаючы на тое, які вынік атрымаеце, вы пазнаёміцеся з вопытнымі спецыялістамі, што ўжо само па сабе вельмі карысна», — лічыць HR-менеджар, кіраўнік аддзела персаналу Qulix Systems Наталля БУРЭЦ. Эксперт у сферы падбору кадраў ведае, як не праваліць гутарку з патэнцыйным наймальнікам наваспечаным кандыдатам, і гатовая дзяліцца сваім досведам з моладдзю.**

— Па-першае, перад сумоўем трэба абмеркаваць сам-насам тыя пытанні, якія маюць для вас прыярытэтнае значэнне, — расказвае суразмоўніца. — Па-другое, спытаць у менеджара, хто будзе прысутнічаць на сустрэчы, які фармат інтэрв'ю, ці трэба нешта паўтарыць, а таксама ці патрэбны нейкія дакументы. На жаль, часта студэнты не запамінаюць назву кампаніі, тых, хто там працуе. Таму парада ўсім — трымайце пад рукой нататнік, каб не пакінуць без увагі важную інфармацыю аб патэнцыйным працадаўцы і вакансіі.

**«Кандыдаты прыходзяць на гутарку, каб уладкавацца на работу, а не каб прадэманстраваць свой стыль. Таму лепш, каб адзенне было звыклым і зручным».**

***— Якія памылкі найперш перашкаджаюць юнакам і дзяўчатам падчас дзелавой размовы?***

— Бывае, што кандыдаты спазняюцца на сумоўе, але не папярэджваюць аб гэтым. А трэба патэлефанаваць HR-менеджару і запытаць, ці можна перанесці сустрэчу на нейкі іншы час. Ужо падчас размовы ў кампаніі з'яўляюцца іншыя пытанні. Напрыклад, бывае, што калі спецыяліст просіць расказаць крыху пра сябе, кандыдат адказвае: «А навошта? Я ж усё распісаў у рэзюмэ». Помніце, у вас ёсць унікальны шанц расказаць нешта цікавае, каб вас адразу запомнілі.

***— Колькі ў ідэале павінна доўжыцца інтэрв'ю з кандыдатам?***

— Пачынаючы з паўгадзіны, заканчваючы поўным рабочым днём. Паверце: за 20 хвілін цяжка ацаніць здольнасці і навыкі юнакоў і дзяўчат. Але некаторыя з іх думаюць, што можна справіцца і за хвілін 15. Таму, каб не апынуцца ў няёмкай сітуацыі, лепш даведацца аб гэтым у спецыяліста, з якім вы дамаўляліся на сумоўе. Іншым часам праходзіць хвілін 40, і малады чалавек пачынае нервавацца, коратка адказваць на пытанні. Цікаўлюся: «Што-небудзь здарылася?» На што атрымліваю адказ: «Ці можна хутчэй? Я спазняюся на наступнае сумоўе...» У такім выпадку становіцца незразумела, чаму кіраўнікі аддзелаў, іншыя спецыялісты выдзяляюць для кандыдата час, а ён — не можа. Калі і праходзіце дзве гутаркі ў адзін дзень, то рабіце вялікі перапынак часу паміж імі. Тады будзеце адчуваць сябе больш упэўнена.

***— У многіх студэнтаў галоўнай матывацыяй работы ў пэўнай кампаніі з'яўляецца заробак. Як вы да гэтага ставіцеся?***

— «Чуў, што тут добра плацяць, таму я хачу да вас». На жаль, такая сітуацыя — не рэдкасць у практыцы. Або іншая: «Гэтая вакансія мяне не вельмі задавальняе, аднак трэба з чагосьці пачынаць...» Не забывайце: кожны наймальнік хоча ўзяць у калектыў таго, хто збіраецца развівацца і доўга знаходзіцца ў кампаніі. Таму выбірайце тую спецыяльнасць, якая сапраўды вам даспадобы.



***— Уявім, што кандыдат адказвае на званкі падчас сумоўя ці выходзіць з кабінета, спасылаючыся на тое, што яму вельмі трэба...***

— Такія паводзіны недапушчальныя. Тэлефон павінен знаходзіцца недзе далёка ад вас, у адключаным стане, каб не адцягваць увагу ад гутаркі. Калі ўсё ж так склалася, што вельмі трэба адказаць на званок, папярэдзьце спецыялістаў загадзя. Тады ўражанне пра вас не будзе сапсавана.



***— А калі негатыўна гаварыць аб папярэднім вопыце работы ў іншым месцы, аб былым работадаўцы?***

— Гэта мінус кандыдату, а не колішняму босу. Патэнцыйны наймальнік слухае і думае: а што, калі праз некалькі гадоў будуць такім жа чынам адзывацца і пра яго? Дарэчы, гэта датычыцца і вучобы ва ўніверсітэце, у школе, стасункаў з рознымі людзьмі... Папярэдні вопыт шмат можа расказаць пра вас як аб прафесіянале і асобе.

***— Сучасныя кампаніі праводзяць сумоўе не толькі ў звыклым фармаце, але і па тэлефоне або скайпе, выкарыстоўваюць групавое, панэльнае інтэрв'ю, калі пытанні задае не адзін спецыяліст, а некалькі, і іншыя...***

— Аднак іншым часам саіскальнікі не вельмі сур'ёзна ставяцца да альтэрнатыўных фарматаў гутаркі са спецыялістамі. Маўляў, гэта толькі падрыхтоўка і можна не напружвацца. Але многія фірмы аддаюць перавагу менавіта такім спосабам правядзення сумоўя. Напрыклад, мы размаўлялі па скайпе з кандыдатам з невялікага горада ў Расіі. Ён вырашыў нас уразіць — сеў на арэлі ў двары свайго дома на фоне прыгожага краявіду. Аднак у гэты ж час яго сусед вырашыў пакасіць газон. Зразумела, што нічога не было чуваць, да таго ж па ноўтбуку хадзіў кот. Вынік: вы павінны знаходзіцца ў асобным пакоі, каб ніхто не перашкаджаў дзелавой размове.

Будзьце ветлівыя са спецыялістамі, якія дамаўляюцца з вамі аб патэнцыйным рабочым месцы. Нават калі вам нецікавая вакансія зараз, гэта не значыць, што так будзе і ў далейшым. Рэкрутары заўсёды робяць пазнакі ў спецыяльнай базе, і праз некалькі гадоў вы можаце пашкадаваць, што выбралі з патэнцыйнымі калегамі не вельмі ветлівы тон размовы.

***— Знешні выгляд — важны паказчык для работадаўца ў вызначэнні выніку сумоўя?***

— Кандыдаты прыходзяць на гутарку, каб уладкавацца на работу, а не каб прадэманстраваць свой стыль. Таму лепш, каб адзенне было звыклым і зручным. Калі ў паўсядзённасці не носіце касцюмы, то не варта апранаць іх на сустрэчу з наймальнікам. Бывае, што ў кампаніях прыняты дзелавы стыль — тады, напрыклад, класічныя штаны можна замяніць джынсамі, пінжак — кашуляй або світарам у мінімалістычным стылі. У дзяўчат ёсць звычка перад важнымі падзеямі наносіць яркі макіяж, выкарыстоўваць пахучыя духі. Але гэта раздражняе нюхальныя рэцэптары. Лічу, што ўсё добра, калі гэта ў меру.

Ад Наталлі дазналіся пра цікавую магчымасць зрабіць сумоўе больш паспяховым.

— Ёсць такі прыём — Elevator speech, ён шырока выкарыстоўваецца ў асяроддзі стартапаў і бізнесу, але можа быць карысны і пры пошуку работы. Яго асноўная адметная рыса — неабходнасць прадставіць сябе патэнцыйнаму працадаўцу або інвестару за абмежаваную колькасць часу, напрыклад, на працягу якога ліфт вязе пасажыраў на паверх (звычайна ад 30 да 60 секундаў). Самапрэзентацыя ў ліфце — надзейны спосаб зацікавіць вельмі занятага чалавека і працягнуць гутарку пазней у больш камфортнай абстаноўцы.

***— Ёсць тое, што выклікае здзіўленне або засмучае вас пасля размовы з кандыдатамі?***

— Няўменне задаваць пытанні. Часта іх у юнакоў і дзяўчат няма, а для прадстаўнікоў кампаніі гэта азначае, што і цікавасці да вакансіі, работы менавіта ў іх таксама не хапае. Навошта запрашаць такіх да сябе?... Але не трэба завучваць універсальны спіс пытанняў, які можна сустрэць на многіх сайтах у інтэрнэце. Выберыце толькі тыя, якія для вас сапраўды важныя. І яшчэ: перад сумоўем або пасля не забывайце спытаць у эйчараў, праз колькі часу вам дадуць адказ, падыходзіце вы ім ці не.

**«Кожны наймальнік хоча ўзяць у калектыў таго, хто збіраецца развівацца і доўга знаходзіцца ў кампаніі. Таму выбірайце тую спецыяльнасць, якая сапраўды вам даспадобы».**

Наталля зазначае, што многія студэнты, якія хочуць працаўладкавацца ў кампанію, упэўнены: сацсеткі — гэта іх асабістая прастора. «Але гэта не так. Перад сустрэчай на сумоўі рэкрутары многіх фірмаў абавязкова праглядаюць вашы старонкі. Таму парада ўсім — перад тым, як шукаць работу, уважліва прагледзьце іх. Калі дзесьці сустракаецца нецэнзурная лексіка — з вялікай доляй верагоднасці вас не прымуць на работу, нават калі вы — прафесіянал сваёй справы».

***— Якіх маладых людзей сустракаеце на сумоўі найчасцей: няўпэўненых у сабе або наадварот, тых, хто лічыць, што любое зададзенае пытанне яму па сілах?***

— Прыкладна аднолькавая колькасць і тых, і іншых. Занадта самаўпэўнены звычайна кажа: «Я гэтага не ведаю, але ж не праблема адкрыць гугл і пачытаць». Зразумела, што ведаць усё немагчыма, і таму калі такая сітуацыя адбываецца раз-другі — гэта прымальна. Але не больш — веды ў галаве па той вакансіі, па якой уладкоўваецеся, быць павінны. Здараюцца і выпадкі, калі кандыдат запэўнівае нас, што ён усё чытаў, амаль усё ведае, але калі мы пачынаем "ганяць" яго па розных аспектах работы, высвятляецца, што словы не супадаюць з рэальнасцю. Або іншая справа: «Я не ведаю адказу на пытанне, магчыма, я ўвогуле нічога не ведаю, лепш пайду дадому...», — кажа юнак або дзяўчына. Але навошта так сябе не паважаць? Не вы вырашаеце, крытычнае няведанне адказу на пытанне ці не, гэта робіць ваш патэнцыйны наймальнік. Таму не настройвайцеся загадзя на дрэнны вынік.

І напрыканцы Наталля Бурэц дадала: «Вас прымаюць на работу за тое, які вы ёсць на самай справе. Не трэба вельмі старацца, напрыклад, быць камунікабельным, калі ў жыцці вы сціплы, спакойны чалавек. Ненатуральнасць у паводзінах заўсёды кідаецца ў вочы».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота дадзена гераіняй.**

Новыя старты

## Знайсці сваю «Зорную дарогу»

**Сусветная арганізацыя выканаўчага майстэрства (Word association of performing arts, WAPA) запускае свой першы праект у Беларусі — міжнародны дыстанцыйны фестываль-конкурс «Зорная дарога». Гэта сумесны праект з Беларускім саюзам музычных дзеячаў, Саюзам кампазітараў Беларусі і БРСМ. Яго галоўная мэта — уцягванне моладзі ў развіццё міжкультурных сувязяў у сферы культуры і мастацтва і паляпшэнне іміджу краіны ў міжкультурнай прасторы.**

Прыняць удзел у конкурсе можа любы ахвотны без нейкіх узроставых абмежаванняў.

Выступаць можна як сольна, так і ў складзе калектываў. Канкурсанты змогуць паспрабаваць свае сілы ў наступных намінацыях: «Тэатральная творчасць», «Найлепшы вядучы», «Эстрадны вакал», «Народны вакал», «Акадэмічны вакал», «Бардаўская песня», «Інструментальная музыка» і «Харэаграфія».

У склад журы ўвайшлі прадстаўнікі з 15 краін свету: музыканты, артысты, кампазітары, рэжысёры, прадзюсары, грамадскія дзеячы і журналісты.

Прыём заявак прадоўжыцца да 15 жніўня. Узнагароджанне фіналістаў і ўдзельнікаў праекта адбудзецца ў канцы жніўня.

Аляксандр Заўгародні, артыст эстрады, лаўрэат міжнародных фестываляў і конкурсаў, лаўрэат Гранд-прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, які ўзначаліў прадстаўніцтва WAPA Belarus, спадзяецца, што конкурс стане слаўнай традыцыяй і выдатным стымулам для сотняў і тысяч таленавітых хлопчыкаў і дзяўчынак, чые мары ўвасобяцца ў рэальнасць. Першы раз фестываль пройдзе ў інтэрнэт-прасторы, але, у будучыні, як спадзяюцца яго арганізатары, у гасцінную Беларусь прыедуць канкурсанты з усяго свету.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Трэці працоўны*

# Студатрады як школа жыцця

**Больш за 25 тысяч юнакоў і дзяўчат выказалі сёлета жаданне працаваць у студэнцкіх атрадах падчас трэцяга працоўнага семестра. Пра гэта расказала камандзір Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў Цэнтральнага камітэта БРСМ Надзея ШАХОЎСКАЯ.**

— Традыцыйна ўдзельнікамі руху могуць стаць маладыя людзі ва ўзросце ад 14 гадоў да 31 года. Адзін з крытэрыяў залічэння ў студатрад — добрая паспяховасць без акадэмічных запазычанасцяў. Пандэмія сёлета ўнесла некаторыя карэктывы: расійскія атрады не змаглі прыехаць, аднак мы з імі пастаянна праводзім розныя анлайн-канферэнцыі. Студатрад — гэта не толькі працоўная брыгада, якая дае магчымасць зарабіць грошы, але яшчэ і шанц паспрабаваць сябе ў прафесіі, згуртавацца з калектывам, раскрыць свой творчы патэнцыял. Да таго ж такая дзейнасць не абыходзіцца без творчасці: у студатрадах арганізаваны вольны час і праводзяцца шматлікія конкурсы. У сярэднім баец можа зарабіць ад 300–400 да 1000 рублёў за працоўны семестр. Усё залежыць ад аб'ёму выкананай работы. Іншымі словамі, гэта школа жыцця для маладых людзей.

Надзея Шахоўская адзначыла, што ў краіне студатрадаўскі рух быў адроджаны пры падтрымцы кіраўніка дзяржавы. І сёння дзякуючы яму, а таксама органам улады, захоўваючы свае найлепшыя традыцыі, ён развіваецца і далей. «Сёлета падпісаны Указ № 58 «Аб арганізацыі дзейнасці студэнцкіх атрадаў на тэрыторыі Беларусі». Ён уступіць у сілу з наступнага года і здыме вельмі многія бар'еры пры фарміраванні студатрадаў, будзе спрыяць таму, каб у студатрадах усіх профіляў хлопцы і дзяўчаты маглі адпрацоўваць і вучэбную практыку», — кажа камандзір штаба студатрадаў.

У гэтым годзе міжнародны вытворчы праект «Атлант-2020» сабраў каля 800 студэнтаў з розных абласцей краіны, расказала яго камандзір Хрысціна ХУБУЛАВА.

— Хлопцы і дзяўчаты займаюцца зборкай халадзільнікаў, апрацоўкай металу і выконваюць іншыя работы. Дзякуючы спаборніцкаму духу яны імкнуцца хутка паляпшаць свае паказчыкі, праект дае стымул працаваць больш эфектыўна. Быў створаны электронны журнал уліку працы, у ім камандзіры і камісары запісваюць асабістыя каэфіцыенты інтэнсіўнасці работы кожнага байца, такім чынам вылічваецца агульны каэфіцыент атрада, па якім можна выбраць найлепшы. Таксама для нас важная не толькі работа, але і тое, што застаецца па-за ёй: розныя мерапрыемствы, конкурсы, гульні. На гэта звяртаем асаблівую ўвагу.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*З нагоды*

# ЗАХОЎВАЮЧЫ ТРАДЫЦЫІ МАЛАДЗЁЖНАГА РУХУ

**У першы дзень жніўня моладзь адзначыла сваё прафесійнае свята — Дзень беларускіх студэнцкіх атрадаў. Хоць яго і няма ў календары афіцыйных дат — гэта традыцыя, якая была закладзена людзьмі, што стаялі каля вытокаў студатрадаўскага руху, і якую, як і сам рух, удалося захаваць.**



Фота з сайта БРСМ.

Ва ўсіх кутках Беларусі, дзе працуюць студэнцкія атрады, прайшлі лінейкі з пасвячэннем у іх байцоў. Адбыліся добраахвотніцкія працоўныя акцыі, адкрытыя дыялогі з удзелам юнакоў і дзяўчат і ветэранаў руху, спартыўныя спаборніцтвы са здачай нарматываў фізкультурна-спартыўнага комплексу «Змагайся! Імкніся! Перамагай!», а таксама творчыя конкурсы, студатрадаўскія вогнішчы, атрадныя спеўкі і многае іншае.

Насычаная праграма святкавання Дня беларускіх студэнцкіх атрадаў была ў байцоў зводнага студэнцкага будаўнічага атрада Усебеларускай маладзёжнай будоўлі «Горад маладосці» і міжнароднага вытворчага працоўнага праекта «Атлант-2020». З самай раніцы на базе інфармацыйнага цэнтра Беларускай АЭС для байцоў маладзёжнай будоўлі правялі экскурсію «Атамная энергетыка і будаўніцтва АЭС».

Удзельнікі працоўнага праекта «Атлант-2020», у сваю чаргу, пазнаёміліся з аб'ектамі сталіцы, на якіх працавалі студэнцкія атрады ў розныя гады. Затым хлопцы і дзяўчаты пабывалі на экскурсіі ў Хатыні, а на Лініі Сталіна іх чакала выступленне заслужанага калектыву Беларусі ансамбля песні і танца ўнутраных войскаў МУС і рэканструкцыя бою Вялікай Айчыннай вайны. У другой палове дня паміж байцамі студэнцкіх атрадаў прайшоў фінал турніру па настольным тэнісе.

Творчыя і інтэлектуальныя складнікі свята працягнуліся і на наступны дзень. Падчас конкурсу «Сродкі індывідуальнай ахові» атрады прадставілі касцюмы, якія раскрылі тэму тэхнікі бяспекі і аховы працы на вытворчасці, і пазмагаліся ў каманднай забаўляльнай гульні «Мазгабойня».

Знакавымі аб'ектамі для студэнцкіх атрадаў у 2020 годзе сталі Беларуская АЭС і сацыякультурныя аб'екты Астраўца, ЗАТ «Атлант» у Мінску, агульнаадукацыйная сярэдняя школа на 1020 месцаў у Баранавічах, рэканструкцыя комплексу будынкаў гарадской клінічнай бальніцы № 3 Гродна, сярэдняя агульнаадукацыйная школа ў Гомелі, рэканструкцыя брацкага пахавання на месцы спаленай вёскі Ола ў Светлагорскім раёне, паліклінікі ў Салігорску і Магілёве.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

*У актыўным рытме*

## Палатка і вогнішча сяброўства

**Спартыўны лагер для замежных студэнтаў «BSUCamp» упершыню арганізаваны ў БДУ.**

Акцыя скіравана на знаёмства моладзі з іншых краін з традыцыямі ўніверсітэта, формамі правядзення вольнага часу, а таксама папулярызацыю здаровага ладу жыцця і паходнага турызму.

Яго праграма ўключае велапаходы, экскурсіі, пікнікі і спартыўныя гульні, майстар-класы па сучасных танцах і асновах фотамайстэрства. Ключавое мерапрыемства — турыстычны паход. У замежных студэнтаў будзе магчымасць праверыць свае сілы ў нязвыклых для горада ўмовах, навучыцца арыентавацца на мясцовасці, ставіць палаткі, майстраваць сховішча і разводзіць вогнішча.

Таксама іх пазнаёмяць з прыроднымі славутасцямі ваколіц Мінска, сядзібна-паркавым комплексам «Лошыцкі парк» і Музеем валуноў.

Арганізатарам «BSUCamp» выступае ўпраўленне міжнародных сувязяў БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Вабіць іх ягада

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

— Мы збіраем буякі на полі, бывае, што працуем і на сунічных палях, — працягвае Віталія. — Часам выконваем і іншыя сельскагаспадарчыя работы. Заробак залежыць ад таго, колькі ягад збяром. Працоўны дзень пачынаецца ў 8 гадзін раніцы і заканчваецца ў 17 гадзін вечара. Ёсць перапынак на абед. Трэба разумець, што такі занятак дакладна не для ўсіх, гэта вялікая фізічная нагрузка, у прыватнасці, з-за ўмоў надвор'я. Калі ідзе дождж, мы ўсё роўна працягваем збіраць ягады, толькі надзяваем плашчы. Калі пячэ сонца — таксама складана вытрымаць, асабліва навічкам. Таму і адбор у каманду быў сур'ёзны, аддавалі перавагу больш адказным і зацікаўленым. Ужо падчас работы, калі бачым, што хтосьці стаміўся, абавязкова дапамагаем адно аднаму, гэта матывуе і натхняе кожнага. Акрамя таго, каб не засумаваць, размаўляем, часам спяваем, слухаем музыку, абмяркоўваем планы на вечар.

Перад пачаткам работы з намі праводзілі інструктаж, і мы вырашылі, што нам патрэбны свой медык, бо бывае, што кусаюцца розныя насякомыя або можна парэзацца лістамі раслін. Выбралі адну са студэнтак, і цяпер пры ёй заўсёды аптэчка, калі што — дапамога будзе забяспечана.

Хлопцы і дзяўчаты жывуць на базе адпачынку «Высокі бераг», што недалёка ад самога месца працы. Як кажа Віталія, ён чымсьці нагадвае летні дзіцячы лагер: там вельмі ўтульна і весела. «Адпачываем па-рознаму: гэта конкурсы, гульні, спартыўныя і культурныя мерапрыемствы. Нам пашанцавала, бо наша база адпачынку знаходзіцца на беразе возера Малочнае, і па вечарах, асабліва калі цёпла і прыгожыя змярканні, сустракаемся на прыродзе».



Работа кіпіць незалежна ад умоў надвор'я.

Суразмоўніца падзялілася, што для яе праца ў студатрадзе — гэта перш за ўсё магчымасць уцячы з гарадской мітусні, пранікнуцца традыцыямі і святамі студатрадаўскага руху, а таксама неблагі спосаб зарабіць.

— Памятаю, пасля першага курса бацькі не разумелі, чаму я гэтым займаюся, — прызнаецца Віталія. — Казалі «лепш адпачні, у цябе наперадзе вучоба, трэба набрацца сіл», але я не слухала і была ўпэўненая, што раблю ўсё правільна. Цяпер жа яны ведаюць, што кожнае лета для мяне — працоўнае, і добра да гэтага ставяцца. З упэўненасцю магу сказаць, што ў выніку такога вопыту ў мяне развіваецца стрэсаўстойлівасць, лідарскія якасці, адказнасць. Для мяне як для камандзіра гэта вельмі важна. Таксама такая дзейнасць — магчымасць наладзіць стасункі з кіраўніцтвам гаспадаркі, рознымі спецыялістамі, што дакладна спатрэбіцца ў далейшым жыцці. Прыемна, што мерапрыемствы і сустрэчы для ўдзельнікаў студатрадаў праходзяць на працягу ўсяго года, так мы становімся яшчэ больш згуртаванымі. А яшчэ нават тыя, хто ўжо выпусціліся з універсітэта, часта цікавяцца, як у нас прайшло лета. Студатрады — асаблівая частка студэнцкага жыцця, у наступным годзе я заканчваю ўніверсітэт, і мне будзе вельмі іх не хапаць.

Таццяна УРБАНОВІЧ, студэнтка трэцяга курса факультэта ветэрынарнай медыцыны, праводзіць лета ў студатрадзе першы раз, хоць жаданне папрацаваць у «Парачанцы» з'явілася ў дзяўчыны яшчэ на першым курсе.



Байцы і пра адпачынак не забываюць.



У ліпені адсвяткаваць Новы год? Лёгка! (камандзір Віталія — у ніжнім радзе ў цэнтры).

— Тады, на жаль, не атрымалася, бо мне не было васямнаццаці гадоў. Памятаю, што ва ўніверсітэце пастаянна казалі, што тут вельмі крута, шмат знаёмых таксама былі часткай каманды атрада і засталіся задаволеныя. Зразумела, большасць студэнтаў ідуць сюды, каб зарабіць, а ў мяне была і іншая матывацыя — атрымаць карысны вопыт, пазнаёміцца і пасябраваць з новымі людзьмі. Калі сказала маме, што хачу паспрабаваць сябе «ў полі», яна папярэдзіла, што гэта вельмі складана і лёгка не будзе. Ну і добра, падумала я. Мне ўсё роўна не хацелася дарма марнаваць час на канікулах. Перад работай наша каманда праходзіла пасвячэнне, камандзір праводзіла з намі розныя трэнінгі і гульні, якія дапамаглі згуртавацца. Першыя дні былі самыя цяжкія, але цяпер прывыкла і ўсё даецца лёгка. Настолькі ўцягнулася, што па начах бывае сніцца: збіраю ягады! Неапрацаваных радоў яшчэ вельмі многа, таму цалкам настроены на працу. Увогуле хацелася б і налета прыехаць, але ў нас будзе вытворчая практыка і мы павінны будзем працаваць на прадпрыемстве. Аднак, калі раптам з'явіцца магчымасць уладкавацца сюды, буду толькі рада.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота дадзены гераінямі.**

Пераемнасць пакаленняў

# САДОК, РОДНЫ З ДЗЯЦІНСТВА

## Тут расла, а зараз працуе колішняя гадаванка

**Вялікая частка маіх успамінаў з маленства звязана са смалявіцкім дзіцячым садком № 3. Вельмі добра памятаю сваю выхавальніцу — Наталлю Валер'еўну Шановіч, якая вучыла ўсіх нас працаваць у камандзе, быць уважлівымі... Як і дзяўчынку, з якой вельмі сябравала, — яе дачку Машу. І нават цяпер, калі праходжу ўздоўж знаёмага будынка, уяўленне малюе карцінкі з дзяцінства, у якіх усміхаюцца знаёмыя твары. Аднойчы, каторы раз шпацыруючы міма, я сапраўды ўбачыла такі. Прыгледзелася — тая самая Маша ШАНОВІЧ, але ўжо не маленькае дзіця, а сур'ёзная дзяўчына — даглядае за маленькімі гарэзамі, сочыць за дысцыплінай...**



Марыя была размеркаваная на работу ў дзіцячы садок пасля заканчэння філіяла МДЛУ «Лінгвагуманітарны каледж» на пасаду падменнай выхавальніцы і выкладчыцы гуртка англійскай мовы. Цікава тое, што, акрамя мамы, яшчэ і бабуля дзяўчыны раней таксама працавала тут жа на пасадзе намесніка па выхаваўчай рабоце, але яна цяпер ужо на пенсіі. Кажучы пра гэта, суразмоўніца з гонарам жартуе: «Можна сказаць, што я патомная выхавальніца».

Але рашэнне размеркавацца ў дзіцячы садок прыйшло не толькі з-за такой «спадчыны». Марыя кажа, што яна заўсёды лічыла дашкольны ўзрост самым камфортным і прыемным для работы, бо, як паказвала практыка ў каледжы, знайсці агульную мову са старэйшымі школьнікамі (9—11 клас) значна больш складана.

На пытанне аб адрозненні работы з дашкольнікамі і вучнямі, Марыя адказвае з пункту гледжання вывучэння англійскай мовы:

— У школе наведвальнасць абавязковая, і яна фіксуецца, таму там можна ўпэўнена рухацца па праграме, не вяртаючыся да паўтарэння адной тэмы некалькі разоў. Таксама ў вучняў звычайна ўжо ёсць базавыя веды замежнай мовы, з імі не ўзнікае некаторых нязручных момантаў. Напрыклад, калі я толькі прыйшла ў дзіцячы садок і пачала заняткі з прывітання на англійскай, дзеці глядзелі на мяне як на іншапланецяніна. Было складана не разгубіцца... Зараз мы з маімі выхаванцамі добра разумеем адно аднаго, і гэта вельмі радуе. Ну і яшчэ адно важнае адрозненне: са школьнікамі амаль не можа здарыцца сітуацыя, калі іх рэпутацыя бывае падмочана ў натуральным сэнсе гэтага слова! *(Усміхаецца.)* З малымі такія і ім падобныя казусы адбываюцца, і вельмі важна дапамагчы ім вырашыць праблему, каб працягваць займацца далей з новымі сіламі.

### СМЕШНЫ ВЫПАДАК

*— Аднойчы дала дзецям заданне: намаляваць штонебудзь, што заўгодна. Усе зрабілі вельмі абстрактныя рэчы, якія без тлумачэння нельга было пазнаць і зразумець. Але, калі прыйшоў час расказваць пра свой малюнак, кожны нешта апісваў: аблокі, рака, лес і іншае. Адзін хлопчык выйшаў, і я спытала яго: «Паша, а што намаляваў ты?» Той уважліва паглядзеў на ўласны твор і сказаў: «А... Гэта калякі-маляки!» Уразіла яго шчырасць!*

З гэтага адказу вынікае пытанне: ці не рана вывучаць замежныя мовы ў дзіцячым садку? Марыя лічыць, што ўводзіць малых у іншамоўную культуру стасункаў лепш за ўсё пачынаць менавіта ў такім узросце, каб у далейшым, у школе, ім было прасцей засвойваць праграму. Таксама дзяўчына кажа, што выхаванцы садка вельмі шчырыя, вельмі зацікаўленыя, таму іх лягчэй заматываваць на далейшае сур'ёзнае вывучэнне мовы. А чым раней пачнеш так займацца — тым большага поспеху дасягнеш.

— Калі выходзіць добра — хочацца рухацца далей, — кажа дзяўчына.

Самым прыемным момантам у сваёй рабоце выхавальніца лічыць паказальныя выступленні для бацькоў, дзе яны з дзецьмі дэманструюць, чаму навучыліся.

Таксама Марыя кажа, што ціхая гадзіна — вельмі зручны час распарадку дня, бо можна не толькі адпачыць, але і пазаймацца пытаннямі вучобы, паколькі яна з'яўляецца студэнткай завочнага аддзялення Інстытута бізнесу БДУ.

Марыя адзначае, што калегі ставяцца да яе добра. Немалаважную ролю ў гэтым, зразумела, адыгрывае тая самая пераемнасць... Яе бабулю і матулю, якая, дарэчы, і зараз тут працуе, вельмі цэняць і паважаюць. А яшчэ дзяўчына лічыць маму выдатным прыкладам для пераймання.

— Працуецца лягчэй, калі ў любы момант можна звярнуцца па параду і табе не адмовяць у дапамозе, — прызнаецца маладая выхавальніца.

Дзяўчына кажа, што ў калектыве хутка знайшла з усімі агульную мову, бо з таго часу, як яна сама была тут выхаванкай, педагагічны склад амаль не змяніўся. Марыя прызнаецца, што яе цёплыя ўспаміны звязаны з гэтым месцам і гэтымі людзьмі, таму працаваць у садку дзяўчыне падабаецца.

**Паліна ПРАКАПЕНЯ,**
**студэнтка II курса факультэта журналістыкі БДУ.**
**Фота з архіва суразмоўніцы.**



# НЕБА. ВЕРТАЛЁТ. ДЗЯЎЧЫНА

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— У дзяцінстве наведвала розныя гурткі і секцыі, аднак найбольшую цікавасць выклікалі тэквандо і плаванне. Пазней, у дзявятым класе, дадаўся лётны спорт. Страху не было наогул, наадварот, хацелася хутчэй навучыцца самой кіраваць планёрам або самалётам. У той год, калі перада мной стаяў выбар, куды паступаць, у Ваенную акадэмію дзяўчат не набіралі. Таму абрала асноўнай дзейнасцю медыцыну, і ні разу не пашкадавала аб гэтым. Разам з тым адразу ж запісалася ў сталічнае ДТСААФ, там сказалі: можам узяць толькі на верталёт, тады атрымаецца жаночы лётны экіпаж. Я пагадзілася. На працягу года вучыла тэорыю, здавала залікі, толькі пасля перайшла да практыкі. Памятаю, сяджу ў аўдыторыі і не зводжу вачэй з акна: больш вопытныя калегі выконваюць фігуры пілатажу ў небе, а мне толькі назірай... Так хацелася хутчэй да іх, на вышыню! — успамінае Насця.

Калі дзяўчыне дазволілі самастойна кіраваць верталётам, прыйшло ўсведамленне: захапленне лётным спортам займае нямала вольнага часу, што для студэнта-медыка — недазвольная раскоша. Але суразмоўніца імкнулася паспяваць усюды. Ведаючы, што яе чакаюць вялікія аб'ёмы работы, брала кніжкі на аэрадром і паміж палётамі рыхтавалася да пар. «За ўсе шэсць гадоў вучобы ў сталіцы я ні разу не сходзіла ў клубы. Таму што ў выхадныя, калі асноўная частка моладзі адпачывала, мяне таксама чакалі палёты. Але гэта вельмі падабалася!»

Лётны сезон у спартсменаў пачынаецца, калі сыходзіць снег. Актыўная падрыхтоўка да значных спаборніцтваў — бліжэй да лета.

— У Беларусі я прымала ўдзел ва ўсіх, таксама выступала у суседніх краінах, каб удасканаліць, «пракачаць» свае навыкі.



У той час, калі я толькі прыйшла ў ДТСААФ, у Польшчы праходзіў Чэмпіянат свету па лётным спорце. Аднак мы з напарніцай яшчэ не былі гатовыя да яго, таму пачалі рыхтавацца да наступнага, што прайшоў у Мінску ў 2018 годзе. Ён доўжыўся некалькі дзён, падрыхтоўка была сур'ёзная, напэўна, таму ў нас з Сафіяй атрымаўся найлепшы вынік за ўсю гісторыю нашых з ёю сумесных палётаў. Падчас спаборніцтваў вельмі важна ўмець слухаць адна адну. Мы ж ніколі не канфліктавалі, не разыходзіліся па розных баках пасля сумеснага палёту. Хоць у іншых спартсменаў час такое адбывалася. Лічу, што гэта няправільна. Падчас чэмпіяната свету Сафія была мозгам верталёта, а я — вачамі. У мае абавязкі ўваходзіла разлічваць курс палёту, працаваць з картай і іншае. Калі трэба было паказваць фігуры пілатажу на малой вышыні, а камандзіру нічога не было відаць, яна ляцела па маіх указаннях. Увогуле часта перад спаборніцтвамі з напарніцай размаўляем з нашымі верталётамі Мі-2, бо лічым, што ў іх ёсць душа.

Пілотам-навічкам Насця дае параду: не апускайце рукі, калі ў вас штосьці не выходзіць, бо з першых хвілін у небе выдатны палёт атрымліваецца рэдка.

— Менавіта ў мяне ніколі не было жадання кінуць гэтую справу. Наадварот, прыкладваю яшчэ больш намаганняў, каб усё атрымалася. Мне вельмі пашанцавала з бацькамі і з інструктарамі. Тата заўсёды дае патрэбныя парады. Адна з галоўных — не баяцца. «Гэта ты кіруеш верталётам, ты галоўная, ён абавязкова будзе слухацца», — запэўніваў бацька. І сапраўды, калі тое разумееш, выходзіць нашмат лепш. У дасягненні паспяховых вынікаў мне добра дапамагае аналіз сваёй работы: ці ўлічыла паказчыкі ветру, ці мякка прызямлілася і іншае. Наступны раз узлятаеш і памятаеш, чаго рабіць не трэба. Таксама я спакойна стаўлюся да канструктыўнай крытыкі, гэта безумоўна развівае.

У сям'і Караткевічаў (дзявочае прозвішча суразмоўніцы) тры дачкі, Анастасія самая старэйшая. Хрысціну, якой зараз дваццаць гадоў, таксама прыцягвае лётны спорт. Яна распачынае, як сястра, з планёра ў Жлобінска-Рагачоўскім аэраклубе, летась прыехала на вучобу ў сталіцу і запісалася там у ДТСААФ. Малодшай Аляксандры яшчэ толькі дванаццаць, таму хто ведае, можа яна, як і сёстры, таксама захоча звязаць сваё жыццё з палётамі...

— Так выйшла, што і мой муж Андрэй таксама лётчык. Усё дзяцінства ён правёў у ваенным гарадку пад Пружанамі, дзе служыў яго бацька. Хлопец быў упэўнены, што стане лётчыкам. Мара ажыццявілася — паступіў у Ваенную акадэмію, зараз мае званне старшага лейтэнанта і штодзень паднімаецца ў неба. Пазнаёміліся мы ў ДТСААФ, калі курсанты-авіятары праходзілі там стажыроўку, сярод іх быў і Андрэй. Пажаніліся два гады таму, вяселле прайшло ў авіяцыйным стылі. Сталы былі ўпрыгожаны фігуркамі самалётаў, замест кнігі пажаданняў — вялікі глобус, на якім госці пакідалі добрыя словы, а на праектары — сумесныя фатаграфіі на авіяцыйную тэматыку. Думаю, гэта крута, што нас аб'ядноўваюць палёты, напрыклад, калі ўсе падзеі абмеркаваныя, можна вечна звяртацца да «сваёй» тэмы.

Пасля заканчэння ўніверсітэта Насця як жонка ваеннага пераехала да Андрэя ў Брэст. Гераіня прызнаецца, што гэтае рашэнне далося ёй цяжка, бо дзяўчына разумела: цяпер падняцца ў неба можна будзе толькі праз некаторы час. «Спадзяюся, што пасля размеркавання мы ўсё ж такі пераедзем у Мінск. Тады дзве любімыя справы — палёты і медыцына — зноў будуць са мной побач. А пакуль што ў мяне інтэрнатура, як малады спецыяліст я патрэбна пацыентам тут, таму з Мі-2 мы сустрэнемся праз год».



**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва герояў.**

*На адрэналіне*

# БРУД АДМЫЕЦЦА — ЭМОЦЫІ ЗАСТАНУЦЦА

## Прыгоды клуба джыпераў з Чэрвеня

**Хто яны, смельчакі на «жалезных звярах», што не баяцца ні глыбокіх ям, ні бруду, ні высокіх сумётаў? Чаму джып — іх найлепшы сябар? І навошта шукаць месцы, адкуль складана выбрацца? На гэтыя пытанні ёсць адказ ва ўдзельнікаў чэрвеньскага клуба «Jeepery_Cherven».**



Андрэй ЮШКО.

Штомесяц на ўскрайку горада можна ўбачыць дзіўную кампанію: некалькі пазадарожнікаў і з дзясятак людзей з рацыямі ды сцягамі. Гэта мясцовы рух джыпераў збіраецца на чарговую так званую пакатушку — выезд на мясцовасць з перашкодамі. Па выбудаваным маршруце іх сустрэнуць размытыя дарогі, паваленыя дрэвы, глыбокія лужыны, брады і ўзгоркі. Менавіта ў іх пераадоленні і заключаецца задача каманды.

**За некалькі гадоў аўтааматары заўважна «падраслі». Цяпер «барыкады» яны праходзяць смела, упэўнена.**

...А пачыналася ўсё з двух братоў, якія некалькі гадоў таму захраслі ў лесе на нядаўна набытым пазадарожніку. Пасля калатнечы зразумелі: трэба заўсёды мець падтрымку і дапамогу. Адзін з іх, 28-гадовы чэрвенец Андрэй ЮШКО кінуў у сацсеткі покліч — стаў шукаць верных сяброў, якія, у выпадку чаго, падставяць не толькі плячо, але і свае «жалеза»...

«Тады «адгукнуліся» дзве машыны. І мы ўсе разам вырашылі стварыць свой клуб, паспрабаваць яго развіваць», — прыгадвае ён.

Пілот і штурман — няхітры склад экіпажа «пакатушак». Задача апошняга — дапамагаць: накіроўваць, «цягаць» тросы, размотваць лябёдку... Але допускаецца і трэці член каманды — другі штурман ці аператар. Яго функцыю часта выконвае сам Андрэй. Атрыманыя здымкі выкладвае ў суполку «УКантакце» «Jeepery_Cherven», а відэа — на Youtube-канал... Бывае і так, што машыны «забітыя пад завязку»: прыязджае шмат ахвотных, каб проста пракаціцца і паглядзець, што гэта за рух такі.





За два гады існавання з трох машын і сямі чалавек клуб вырас да некалькіх дзясяткаў аўто. І хоць некаторых «коней» ужо няма, людзі засталіся. Сярэдні ўзрост членаў каманды — каля 30 гадоў. А самаму малодшаму ўдзельніку — чатыры. «Гэта мой сын. Яго ў нас называюць малодшым штурманам, — тлумачыць суразмоўнік. — Ужо два гады я стараюся браць сына на ўсе заезды. А калі не атрымліваецца, ён крыўдуе. І я рады, што той так прывязаны да клуба. Няхай лепш будзе ездзіць са мной, чым сядзець у планшэце ці тэлефоне».





**Аднаклубнікам цікава даследаваць родны край, мясціны, дзе звычайныя машыны не ездзяць.**

У арсенале клуба — самыя розныя пазадарожнікі: УАЗы, Ніва, Nissan Patrol, Jeep Grand Cherokee... У залежнасці ад гэтага і пракладваецца маршрут, каб зручна было ўсім. «Калі нашаму УАЗіку без розніцы, праз што пераходзіць, то іншым, асабліва дарагім аўтамабілям, складана. І, каб не выцягваць паўдня тую машыну, часам даводзіцца ахвяраваць сваімі інтарэсамі і выбіраць штосьці прасцейшае, — кажа ідэйны натхняльнік клуба. — Абавязковых перашкод няма, але ўсе хочуць бруду *(усміхаецца)*. Чым больш — тым лепш. Наш «бязбашневы» экіпаж таксама любіць ямы, рэчкі, канавы...» Аднойчы ўдзельнікі нават памкнуліся ўзняцца на мясцовы кар'ер. Але рызыкнулі не ўсе: там даволі крута.

Такі занятак можа падацца небяспечным. «Дык і па вуліцах небяспечна часам ісці, — лічыць мужчына. — Але я вельмі адказна падыходжу да бяспекі. Ёсць у нас неабходнае ахоўнае абсталяванне, каскі...»

У руху — не толькі чэрвенцы. Прыязджаюць аднадумцы з Мінска, Лагойска, Пухавіцкага раёна, каб праверыць сваё магчымасці. «А ўсё таму, што ў нас добры ўзровень, — упэўнены джыпер. — І ёсць усё неабходнае для бяспекі, напрыклад, спецыяльныя тросы, каб не пакінуць у бядзе таварыша, які захрас на дарозе».

Удзельнічаючы ў руху, кожны джыпер набывае досвед, неабходны для таго, каб лягчэй спраўляцца з непагаддзю і хітрыкамі прыроды ў паўсядзённым жыцці.

Акрамя такога досведу, аднаклубнікам цікава даследаваць родны край, мясціны, дзе звычайныя машыны не ездзяць. «У адну з такіх паездак нам паказалі 500-гадовы дуб! Цікава было дабрацца і да Дзікага возера, з якім звязана мясцовая легенда. Таксама часта ў глухім лесе мы знаходзім помнікі салдатам», — расказвае Андрэй.

У «Jeepery_Cherven» вялікую ўвагу аддаюць і патрыятычнаму выхаванню. Выезды прывязваюць да Дня Перамогі, 22 чэрвеня, Дня Незалежнасці... Не так даўно яны наведалі мемарыяльныя комплексы «Папова Града» і «Весялова». Нямецкія акупанты спалілі абедзве вёскі разам з жыхарамі...

...За некалькі гадоў аўтааматары заўважна «падраслі». Цяпер «барыкады» яны праходзяць смела, упэўнена. Ужо нават не хапае вастрыні. Таму пачынаюць спрабаваць удзельнічаць у спаборніцтвах рэспубліканскага маштабу. Так, у сакавіку паказалі сябе ў штогадовай жаночай пазадарожнай гонцы «Калекцыя Вясна 2020», прымеркаванай да Міжнароднага жаночага дня. Пілотам была дзяўчына Тацццяна, якая смела брала перашкоды. Удзельнікі таксама разгадвалі загадкі, квэсты і арыентаваліся па «легендзе». Андрэй дзеліцца эмоцыямі: «Мы імкнуліся зразумець, што такое пазадарожныя спаборніцтвы, навучыцца карыстацца арыенцірамі, атрымаць незабыўны досвед і яркія эмоцыі».

А нядаўна клуб удзельнічаў у новым фармаце пазадарожных спаборніцтваў — цалкам бескантактавым GPS-арыентаванні «Анлайн трофі-2020», куды іх запрасілі мінчане. Тады не абышлося без паломак. «Мы даведаліся пра сапраўды слабыя месцы нашых машын у такіх складаных умовах, і гэтыя недахопы будуць ліквідаваныя». Клуб паказаў не найгоршыя вынікі, пры тым, што ўдзельнічаў упершыню.

**«Абавязковых перашкод няма, але ўсе хочуць бруду. Чым больш — тым лепш».**

Эмоцыі ад «пакатушак» і спаборніцтваў мужчына не можа перадаць словамі: «Я працую ў IT-сферы, гэта больш разумовая праца. А калі я катаюся, галава адключаецца цалкам ад мітусні, рабочых момантаў, бытавых рэчаў і праблем. Ты проста едзеш і заняты толькі гэтай справай. Адчуванне, якое не забываецца».

Аднаклубнікі лічаць гэтаксама. Ім не патрэбна нічога, акрамя ўдачы, азарту, пазітыву і яскравых падзей. Нездарма ж Андрэй Юшко выбраў дэвіз, які напісаў на машыне: «Бруд адмыецца — эмоцыі застануцца».



**Юлія АДАМОВІЧ.**
**Фота дадзены суразмоўнікам.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
06 08 2020 г.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н. С. извещает о проведении 9 сентября 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** **1.** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** Земельный участок под объект продажи **(лот № № 1, 2, 3)** будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается) | | | |
| **Местонахождение лотов № № 1–67:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Информация о земельном участке:** лот № № 1–3 расположены на земельном участке с кадастровым номером **340800000004000100** общей площадью **10,1123 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания производственных зданий завода | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14108** площадью **12 563,1 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **цех металлоконструкций.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, 8/9. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «БПС-Сбербанк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 24.02.2016 № 320-00002/16-01. Договор о залоге (ипотеке) | **1 768 000,00** | 176 800,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14071** площадью **139,2 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально- технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание склада для хранения легковоспламеняющейся жидкости.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, 8 | **24 400,00** | 2 440,00 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14075** площадью **240,9 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное панельное здание компрессорной с кирпичной отапливаемой пристройкой (20 м. куб. в минуту).** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, 8 | **46 200,00** | 4 620,00 |
| 4 | Мазутохранилище (5 емкостей на 250 тонн мазута), инв. № 483 | **19 500,00** | 1 950,00 |
| 5 | Мазутохранилище (2 емкости на 100 тонн мазута), инв. № 483 | **4 800,00** | 480,00 |
| 6 | Блок контейнер (бытовка), инв. № 61392 | **3 500,00** | 350,00 |
| 7 | Барабан для сушки песка, инв. № 61038 | **2 700,00** | 270,00 |
| 8 | Лестница с площадкой для стропальщиков, инв. № 61095 | **2 300,00** | 230,00 |
| 9 | Площадка передвижная для сборки экскаватора, инв. № 61079 | **600,00** | 60,00 |
| 10 | Сварочный аппарат ВА-500 MIG/MAG, инв. № 61185 | **3 100,00** | 310,00 |
| 11 | Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61231 | **3 500,00** | 350,00 |
| 12 | Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61279 | **3 500,00** | 350,00 |
| 13 | Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61280 | **3 500,00** | 350,00 |
| 14 | Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61281 | **3 500,00** | 350,00 |
| 15 | Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61282 | **3 500,00** | 350,00 |
| 16 | Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61317 | **3 800,00** | 380,00 |
| 17 | Стенд для сборки бортов форм, инв. № 60984 | **7 700,00** | 770,00 |
| 18 | Стенд для сборки бортов форм ЖБИ, инв. № 60724 | **11 300,00** | 1 130,00 |
| 19 | Стенд для сварки балок, инв. № 61409 | **4 900,00** | 490,00 |
| 20 | Стенд для сварки балок, инв. № 61410 | **4 900,00** | 490,00 |
| 21 | Стенд для испытания шлиф. камней, инв. № 112 | **3 000,00** | 300,00 |
| 22 | Станок для перемотки проволоки, инв. № 50329 | **2 300,00** | 230,00 |
| 23 | Источник питания FASTMIG Basic KM 500, инв. № 60841 | **4 200,00** | 420,00 |
| 24 | Машина мозаично-шлифовальная СО-307, инв. № 60955 | **1 000,00** | 100,00 |
| 25 | Машина мозаично-шлифовальная СО (380В/5кВт), инв. № 60712 | **1 000,00** | 100,00 |
| 26 | Печь для прокалки электродов ЭПЭ 140/400, инв. № 60556 | **400,00** | 40,00 |
| 27 | Сварочный аппарат JASIC MIG 400, инв. № 61379 | **1 800,00** | 180,00 |
| 28 | Станок для гибки арматуры МГА-1, инв. № 61070 | **2 800,00** | 280,00 |
| 29 | Кран мостовой г/п 5тн, ширина пролета 22.5 м, инв. № 50113 | **6 400,00** | 640,00 |
| 30 | Кран мостовой г/п 5тн, ширина пролета 22.5 м, инв. № 50114 | **6 400,00** | 640,00 |
| 31 | Кран мостовой г/п 5тн, ширина пролета 22.5 м, инв. № 50112 | **6 400,00** | 640,00 |
| 32 | Автомат питьевой воды «Экомастер» WL850, инв. № 50909 | **200,00** | 20,00 |
| 33 | Аппарат пылеулавливающий ЗИЛ-900 1,5/3000, инв. № 61261 | **800,00** | 80,00 |
| 34 | Аппарат газированной воды «Дельта», инв. № 61243 | **4 800,00** | 480,00 |
| 35 | Аппарат газированной воды «Дельта», инв. № 61244 | **4 800,00** | 480,00 |
| 36 | Станок протяжной, инв. № 10 | **21 100,00** | 2 110,00 |
| 37 | Окрасочный агрегат Меркур 48:1,75 на колесах, инв. № 61418 | **5 400,00** | 540,00 |
| 38 | Станок комбинированный СР 3.01, инв. № 61088 | **6 200,00** | 620,00 |
| 39 | Промышленный пылесос ОР-1500, инв. № 60707 | **400,00** | 40,00 |
| 40 | Циклон Н7353 для МТР Комета, инв. № 61093 | **2 000,00** | 200,00 |
| 41 | Машина термической резки Комета МП-6Кл-2.5-10-8-1, инв. № 60728 | **46 000,00** | 4 600,00 |
| 42 | Стол раскройный к МТР «Комета» цех 2, инв. № 60993 | **5 000,00** | 500,00 |
| 43 | Машина термической резки Комета МП-2К-1Пл-2-8-12-1, инв. № 60670 | **28 000,00** | 2 800,00 |
| 44 | Стол к газорезательной машине «Комета», инв. № 60684 | **4 000,00** | 400,00 |
| 45 | Пескоструйная установка цеха № 2, инв. № 60591 | **8 000,00** | 800,00 |
| 46 | Пескоструйная установка цеха № 1, инв. № 60633 | **22 000,00** | 2 200,00 |
| 47 | Стол раскройный к «Комете» цеха № 1, инв. № 60963 | **2 000,00** | 200,00 |
| 48 | Стол раскройный к «Комете» цеха № 1, инв. № 60982 | **33 000,00** | 3 300,00 |
| 49 | Машина швейная промышленная 131-73+3 прач., инв. № 60730 | **1 000,00** | 100,00 |
| 50 | Котел водогрейный КВ-1, инв. № 60553 | **16 000,00** | 1 600,00 |
| 51 | Котел водогрейный КВ-1, инв. № 60551 | **16 000,00** | 1 600,00 |
| 52 | Универсальный источник питания DC-1000 (К1387-3), инв. № 60775 | **28 000,00** | 2 800,00 |
| 53 | Установка для сварки балок LHM-4000, инв. № 61313 | **27 000,00** | 2 700,00 |
| 54 | Источник питания FASTMIG Synergic KMS 500, инв. № 60843 | **3 000,00** | 300,00 |
| 55 | Полуавтомат сварочный Origo Nig 502c, инв. № 61216 | **4 000,00** | 400,00 |
| 56 | Прибор контроля проверки деталей, инв. № 60425 | **300,00** | 30,00 |
| 57 | Стилоскоп СПЕКТР, инв. № 60162 | **1 400,00** | 140,00 |
| 58 | Осциллограф С-155П6507 (С1-65А), инв. № 60157 | **200,00** | 20,00 |
| 59 | Циклон СЦН-40-400, инв. № 61405 | **400,00** | 40,00 |
| 60 | Циклон СЦН-40-400, инв. № 61404 | **400,00** | 40,00 |
| 61 | Циклон СЦН-40-400, инв. № 61403 | **400,00** | 40,00 |
| 62 | Станок деревообрабатывающий КСМ-1, инв. № 50353 | **1 400,00** | 140,00 |
| 63 | Станок для правки грибовидности балок, инв. № 50603 | **15 000,00** | 1 500,00 |
| 64 | Вертикально-фрезерный станок 6Р12, инв. № 156 | **3 300,00** | 330,00 |
| 65 | Шлифовальный станок 3Б634, инв. № 155 | **1 900,00** | 190,00 |
| 66 | Круглошлифовальный станок 3Б161, инв. № 20816 | **5 600,00** | 560,00 |
| 67 | Станок мод. РТ2631, 2008 года ввода в эксплуатацию, инв. № 60914, инв. № | **55 000,00** | 5 500,00 |

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», ул. Школьная, 8, 247210, г. Жлобин, Гомельская область. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович.** Шаг аукционных торгов – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. **Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**; **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 6 августа 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 7 сентября 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## О реализации дебиторской задолженности ЧТПУП «Травира»

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Управляющий по делу о банкротстве ЧТПУП «Травира» – ИП Угольник Дмитрий Геннадьевич: 220136, г. Минск, а/я 194, тел. +375 29 636 35 22 |
| **Продавец** | ЧТПУП «Травира» – 223017, Минская обл., Минский р-н, аг. Гатово, ОАО «Черметремонт», здание цеха ширпотреба, УНП 691389533 |
| **Форма, дата, время и место проведения торгов** | Торги в форме открытого аукциона **21.08.2020 в 10.00** в помещении экономического суда Минской области: г. Минск, ул. Жилуновича, 15 |
| **Сведения о предмете торгов, начальная цена предмета торгов** | Дебиторская задолженность:<br>Лот № 1: УП «Агрокомбинат Ждановичи» на сумму 8 557,28 рубля;<br>Лот № 2: ОАО «Бельковщина» на сумму 18 520,31 рубля;<br>Лот № 3: ОАО «Бешенковичи агроервис» на сумму 1 567,46 рубля;<br>Лот № 4: ОАО «Глубокский комбикормовый завод» на сумму 2 788,63 рубля;<br>Лот № 6: ОАО «Забудова Агро» на сумму 20 881,22 рубля;<br>Лот № 7: ОАО «Лапичи» на сумму 68 696,72 рубля;<br>Лот № 8: ОАО «Лазовичи» на сумму 3 679,18 рубля;<br>Лот № 9: СПК «Любищицы» на сумму 24 157,13 рубля;<br>Лот № 10: ОАО «Могилевхлебопродукт» на сумму 14 989,98 рубля;<br>Лот № 11: КСУП «Племзавод «Ленино» на сумму 5 139,20 рубля;<br>Лот № 12: ОАО «Речицкий комбинат хлебопродуктов» на сумму 6 427,57 рубля;<br>Лот № 13: ОАО «Рита» на сумму 11 138,80 рубля;<br>Лот № 14: ОАО «Строительно-монтажный трест № 19» на сумму 94 179,55 рубля;<br>Лот № 15: ОАО «Чемерисский» на сумму 31 271,67 рубля;<br>Лот № 16: ОАО «Экспериментальная база Чериков» на сумму 11 393,51 рубля;<br>Лот № 17: ОАО «Западный Агро» на сумму 37 485,67 рубля;<br>Лот № 18: ОАО Гомельоблстрой» на сумму 21 362,43 рубля;<br>Лот № 19: КСУП «Песковцы» на сумму 10 373,76 рубля;<br>Лот № 20: КСУП «Субботники» на сумму 2 873,29 рубля.<br>С более подробной информацией о порядке, условиях проведения торгов, предмете торгов и стоимости имущества можно ознакомиться в рабочие дни с 09.00 до 18.00 по тел. +375 29 636 35 22 |
**Товар** – нефтепродукты и сопутствующие товары за исключением табачных изделий, алкогольных напитков, пива и слабоалкогольных напитков.

**Товар-активатор** – сопутствующие товары, реализуемые в сети АЗС «Газпромнефть». Присутствие в чеке как минимум одного из данных товаров обязательно.

**Интернет-сайт** – www.promo-gpn.by

**1. Организатор Рекламной игры.**

Организатором Рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «АМК «РЭПКА», Республика Беларусь, г. Минск, ул. Будславская, д. 2, оф. 11, 220053, УНП 191728827.

**2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.**

Заинтересованным лицом Рекламной игры является Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Газпромнефть–Белнефтепродукт», Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, д. 70, 4-й этаж, пом. 24, УНП 191118996.

**3. Участники Рекламной игры.**

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие или пребывающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие или пребывающие в Республике Беларусь, достигшие 18 лет (далее по тексту – Участники).

Участниками игры являются держатели Карт Лояльности, приобретенные как до начала Игры, так и в период ее проведения.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Заинтересованным лицом и Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**4. Наименование Рекламной игры:** «Включайтесь в игру».

**5. Территория проведения Рекламной игры**: АЗС, расположенные на территории Республики Беларусь.

**6. Дата начала Рекламной игры:** 10 августа 2020 года.

**7. Дата окончания Рекламной игры:** 26 ноября 2020 года.

**8. Наименование товаров или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:**

игра проводится в целях стимулирования продаж Товаров, реализуемых на АЗС, с условием обязательной покупки как минимум одного Товара-активатора из следующих наименований:

| № | Наименование | № | Наименование |
|---|---|---|---|
| 1 | Гриль-дог Sibylla сосиска говяжья XXL, 220 г | 17 | Нап Drive Cafe Горячий шоколад, XL |
| 2 | Гриль-дог Sibylla сосиска говяжья, 173 г, Беларусь | 18 | Кофе Drive Cafe Капучино Grand, 0,4л |
| 3 | Гриль-дог Sibylla сосиска говяжья сыр, 174 г, Беларусь | 19 | Кофе Drive Cafe Латте Grand, 0,4 л |
| 4 | Гриль-дог Sibylla сосиска куриная, 180 г, Беларусь | 20 | Кофе Drive Cafe Моккачино Grand, 0,4 л |
| 5 | Френч-дог Sibylla сосиска говяжья XXL, 215 г, Беларусь | 21 | Напиток DC Горячий шоколад Grand, 0,4 л |
| 6 | Френч-дог Sibylla сосиска говяжья, 168 г, Беларусь | 22 | Слойка Кленовый Пекан, 90 г |
| 7 | Френч-дог Sibylla сосиска говяжья сыр, 169 г, Беларусь | 23 | Круассан «Миндальный французский», 120 г |
| 8 | Френч-дог Sibylla сосиска куриная, 175 г, Беларусь | 24 | Маффин ванильный, 120 г |
| 9 | Гамбургер Sibylla, 277 г Беларусь | 25 | Маффин шоколадный, 120 г |
| 10 | Чизбургер Sibylla говяжий, 277 г, Беларусь | 26 | Слойка с сыром и ветчиной, 100 г |
| 11 | Кофе Drive Cafe Espresso XL, 0,1 л | 27 | Улитка с сыром, 95 г |
| 12 | Кофе Drive Cafe Американо XL, 0,3 л | 28 | Круассан Drive Cafe лимон, апельсин, 90 г |
| 13 | Кофе Drive Cafe Капучино XL, 0,3 л | 29 | Круассан Drive Cafe малина, 90 г |
| 14 | Кофе Drive Cafe Латте XL, 0,3 л | 30 | Круассан Drive Cafe карамель, 90 г |
| 15 | Кофе Drive Cafe Мокачино XL | 31 | Круассан Drive Cafe банан, 90 г |
| 16 | Кофе G-Drive XL, 0,12 л | 32 | Напиток энергетический G-Drive Extra ж/б, 0,45 л |

**9. Призовой фонд Рекламной игры.**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Заинтересованного лица в размере 21 529,43 (двадцать одна тысяча пятьсот двадцать девять) белорусских рублей 43 копейки. Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы (далее – Призы, Таблица 1):

**Таблица № 1**

| Состав призового фонда | Количество, шт. | Стоимость за единицу, бел. руб. | Общая стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Приз № 1** | | | |
| Мяч футбольный ADIDAS TEAM TRAINING PRO CZ2233 r5 | 30 | 50,004 | 1 500,12 |
| **Приз № 2** | | | |
| Портативное зарядное устройство Xiaomi Mi Power Bank 2i 10000mAh/VXN4229CN | 30 | 48,96 | 1 468,80 |
| **Приз № 3** | | | |
| Фитнес-браслет Xiaomi Mi Smart Band 4 (русская версия) | 10 | 84,00 | 840,00 |
| **Приз № 4** | | | |
| Наушники JBL Tune 120 TWS, цвет – черно-зеленый | 10 | 180,00 | 1 800,00 |
| Денежное вознаграждение | 10 | 5,98 | 59,80 |
| **Приз № 5** | | | |
| Настольный футбол GS-ST-1339 | 10 | 450,00 | 4 500,00 |
| Денежное вознаграждение | 10 | 46,32 | 463,20 |
| **Приз № 6** | | | |
| Игровая приставка Sony PlayStation 4 Slim 1TB + 3 игры/PS719926108 (с подпиской на 3 месяца) | 5 | 999,96 | 4 999,80 |
| Денежное вознаграждение | 5 | 128,50 | 642,50 |
| **Приз № 7** | | | |
| Телевизор Samsung QE55Q80RAUXRU | 1 | 4 590,23 | 4 590,23 |
| Денежное вознаграждение | 1 | 664,98 | 664,98 |
| | | **ИТОГО** | **21 529,43** |

**10. Порядок участия в Рекламной игре.**

**10.1** Для участия в Рекламной игре необходимо:

10.1.1. в срок с 10.08.2020 г. по 11.10.2020 г. включительно на любой АЗС совершить покупку Товаров на сумму не менее 40,00 (сорока) белорусских рублей 00 копеек, включая Товар-активатор, согласно перечню, приведенному в п. 8 настоящих Правил, предъявив при оплате личную Карту Лояльности. За каждые полные 40 рублей 00 копеек в чеке начисляется один Игровой код.

10.1.2. в срок с 10.08.2020 г. по 11.10.2020 г. достоверно заполнить Персональные данные и подтвердить согласие на участие в Рекламной игре на Интернет-сайте, а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно);
- адрес электронной почты (обязательно);
- абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате (обязательно);
- почтовый адрес включая индекс (обязательно);
- номер Карты Лояльности (обязательно).

10.1.3. при первом выполнении условий п. 10.1.1 Игровой Код необходимо зарегистрировать в личном кабинете, при повторном выполнении условий п. 10.1.1 Игровой Код присваивается автоматически, без подтверждения персональных данных и ввода Игрового Кода. Игровой код также отображается в кассовом чеке.

Присвоенный Игровой Код отображается в диалоговом окне личного кабинета Участника в течение 3 (трех) рабочих дней с момента присвоения.

**10.2.** В рекламной игре участвуют Игровые Коды, присвоенные за покупки, совершенные с 10.08.2020 г. по 11.10.2020 г. включительно. В рекламной игре не участвуют Игровые коды, присвоенные за покупки, до 10.08.2020 г. или после 11.10.2020.

**10.3.** С 10.08.2020 г. по 11.10.2020 г. за зарегистрированные Игровые коды согласно п. 10.1. присваиваются Баллы и отображаются в личном кабинете Участника.

**10.4.** За каждый Игровой код начисляется один Балл. Для участия в розыгрыше призов необходимо выбрать номер Розыгрыша и обменять Баллы на Шансы, исходя из наличия Баллов в личном кабинете, но не позднее сроков, указанных в таблице 3. В зависимости от количества имеющихся Баллов у Участника, он может обменять Баллы на один или несколько Шансов согласно Таблице 2:

**Таблица № 2**

| № Розыгрыша | Стоимость одного шанса |
|---|---|
| Розыгрыш № 1 | 2 балла |
| Розыгрыш № 2 | 4 балла |
| Розыгрыш № 3 | 6 балла |
| Розыгрыш № 4 | 9 баллов |

**10.5.** За каждый обмен Баллов присваивается Номер Шанса. В розыгрыше призов участвуют Номера шансов только тех участников, которые указали необходимые данные на Интернет-сайте и подтвердили свое согласие на участие в Рекламной игре.

**10.6.** Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии выполнения п. 10.1 настоящих Правил и выполнения требований, необходимых для участия в Рекламной игре.

**10.7.** Участники при заполнении Персональных данных на Интернет-сайте обязаны вводить полную и достоверную информацию.

**10.8.** Организатор не несет ответственность за ошибки, допущенные Участниками Рекламной игры, за полноту и достоверность сведений и Персональных данных, указанных на Интернет-сайте.

**11. Место, дата, время и порядок проведения Розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры:**

Розыгрыши Призов состоятся в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. Будславская, д. 2, офис 11, согласно Таблице № 3.

**11.1.** К моменту Розыгрыша Призов Организатором формируется список из Номеров Шансов, полученных согласно п. 10 настоящих Правил (далее – Список), с указанием фамилии, имени, отчества Участников, и присвоенного Номера Шанса по дате и времени обмена Баллов, номеров Карт Лояльности, даты регистрации на Интернет-сайте.

**Таблица № 3**

| № розыгрыша | Дата и время проведения розыгрышей | Участник обменял баллы на шансы при выборе Розыгрыша в личном кабинете | Призы для розыгрыша |
|---|---|---|---|
| Розыгрыш № 1 | 17.09.2020, в 13.00 | не позднее 23:59:00 10.09.2020 | 1. Приз 1 – 30 шт. 2. Приз 2 – 30 шт. |
| Розыгрыш № 2 | 31.09.2020, В 13.00 | не позднее 23:59:00 24.09.2020 | 1. Приз 3 – 10 шт. 2. Приз 4 – 10 шт. |
| Розыгрыш № 3 | 20.10.2020, В 13.00 | не позднее 23:59:00 16.10.2020 | 1. Приз 5 – 10 шт. 2. Приз 6 – 5 шт. |
| Розыгрыш № 4 | 20.10.2020, В 13.30 | не позднее 23:59:00 16.10.2020 | 1. Приз 7 – 1 шт. |

Вышеуказанные Призы разыгрываются в порядке, указанном в Таблице № 3.

**11.2.** Для проведения Розыгрышей Призов 1–7 используется лототрон и 10 одинаковых непрозрачных шаров с цифрами от 0 до 9 внутри. Определение номеров Победителей происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из лототрона. Для определения первой слева цифры номера Победителя лицо, проводящее Розыгрыш, помещает в лототрон шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового Номера Шанса согласно соответствующему списку. Шары перемешиваются, из лототрона путем случайной выборки извлекается шар, номер которого определяет искомую цифру. Для определения второй и последующих цифр номера Победителя в лототрон загружаются все десять шаров. После извлечения каждого шара производится проверка на соответствие полученной комбинации цифр Номеру Шанса согласно соответствующему списку. При отсутствии полученной комбинации цифр в номерах по списку извлеченный шар не возвращается в лототрон, а лицо, проводящее Розыгрыш, извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация не совпадет с Номером Шанса по списку.

Процедура повторяется до определения 30 Победителей Приза 1, 30 Победителей Приза 2, 10 Победителей Приза 3, 10 Победителей Приза 4, 10 Победителей Приза 5, 5 Победителей Приза 6 и 1 Победителя Приза 7.

**11.3.** При проведении Розыгрышей Призов 1–7 Организатор дополнительно определяет по 1 (одному) резервному Номеру Шанса для каждого из этих Призов.

11.3.1. Резервным Победителем становится обладатель Номера Шанса, следующий за выигрышным. Если следующий за выигрышным Номер Шанса принадлежит Победителю одного из Призов, то выигрышным становится следующий после него первый Номер иного Шанса. В случае если Номер Шанса попадает на конец списка, то выигрышным будет считаться первый Номер иного Шанса с начала списка.

**11.4.** Один и тот же Участник не может быть признан Победителем более одного раза в рамках одного Розыгрыша. В случае если при проведении Розыгрыша выпадает Номер Шанса, уже признанный Победителем, Победителем признается обладатель следующего Номера Шанса. В случае если Номер Шанса попадает на конец списка, то выигрышным будет считаться первый Номер иного Шанса с начала списка.

**11.5.** Результат Розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе Розыгрыша, подписанном присутствующими на заседании членами комиссии.

**12. Порядок уведомления Победителей о результатах Розыгрыша, получении выигрыша.**

**12.1.** Победители Рекламной игры извещаются о выигрыше согласно Таблице № 4, посредством отправки уведомления на адрес электронной почты, указанный в личном кабинете при регистрации, а также звонком по номеру телефона, указанному Участником на Интернет-сайте.

**Таблица № 4**

| № розыгрыша | Победители Рекламной игры извещаются о выигрыше не позднее |
|---|---|
| Розыгрыш № 1 | 23.09.2020 года |
| Розыгрыш № 2 | 07.10.2020 года |
| Розыгрыш № 3 | 26.10.2020 года |
| Розыгрыш № 4 | 26.10.2020 года |

**12.2.** Для получения Призов Победителям необходимо согласно Таблице № 5 прибыть в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Будславская, д. 2, офис 11 с предварительным согласованием даты и времени прибытия победителя с представителем Организатора по телефонам: +37544 7269008; +37533 3009978.

**Таблица № 5**

| № розыгрыша | № Приз | Дата выдачи Призов с … по … |
|---|---|---|
| Розыгрыш № 1 | Приз 1–2 | с 24.09.2020 по 09.10.2020 с 12 до 17.00 в будние дни либо в субботу, 03.10.2020 г., с 10.00 до 13.00 |
| Розыгрыш № 2 | Приз 3–4 | с 08.10.2020 по 22.10.2020 с 12 до 17.00 в будние дни либо в субботу, 17.10.2020 г., с 10.00 до 13.00 |
| Розыгрыш № 3 | Приз 5–6 | с 27.10.2020 по 10.11.2020 с 12 до 17.00 в будние дни либо в субботу, 31.10.2020 г., с 10.00 до 13.00 |
| Розыгрыш № 4 | Приз 7 | с 27.10.2020 по 10.11.2020 с 12 до 17.00 в будние дни либо в субботу, 31.10.2020 г., с 10.00 до 13.00 |

При получении Призов 1–7 Победитель должен предъявить паспорт гражданина Республики Беларусь (или вид на жительство).

**12.3.** Для получения Призов 1–3 при помощи почтового отправления необходимо в срок согласно Таблице № 6:

**А)** По телефонам Организатора Рекламной игры: +37544 7269008; +37533 3009978 сообщить о желании получить Приз путем почтового отправления;

**Б)** Отправить на электронный адрес Организатора Рекламной игры (info@rapka.by):

- файл-изображение 25, 31 и 33 страниц паспорта (вида на жительство) победителя;
- сообщение с указанием адреса (город, улица, номер дома, квартира, индекс), на который необходимо отправить Приз.

**Таблица № 6**

| № розыгрыша | Приз | Дата отправки данных на эл. почту Организатора | Дата отправки Приза Победителю Рекламной игры при помощи почтовой связи, при соблюдении вышеперечисленных условий |
|---|---|---|---|
| Розыгрыш № 1 | Приз 1–2 | до 09.10.2020 | до 30.10.2020 |
| Розыгрыш № 2 | Приз 3 | до 22.10.2020 | до 30.10.2020 |

**12.4.** В соответствии с главой 16 Налогового Кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении призов выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из доходов получателя Приза 4–7.

12.4.1. Организатор не несет ответственности за возникновение необходимости уплаты дополнительного подоходного налога и иных выплат, связанных с получением Призов, за пределами Республики Беларусь.

12.4.2. Организатор Рекламной игры имеет право запросить, а Участник-Победитель обязан предоставить свои персональные данные (идентификационный номер, фамилия, собственное имя отчество, данные о регистрации по месту жительства и(или) месту пребывания, номер документа удостоверяющего личность, орган и дату его выдачи) в случае, если данный Участник, участвуя в проводимых Организатором рекламных играх, акциях, иных рекламных мероприятиях, стал в 2020 году обладателем призов (денежных) на сумму более 140 рублей.

**12.5.** В случае если Победители Призов 1–7 не выполнят действия, перечисленные в п.п. 12.2.–12.3., в установленные сроки, либо с Победителями не удастся связаться согласно Таблице № 4 и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, указанных ими на Интернет-сайте, они утрачивают право на получение Приза.

Право на получение Призов 1-7 переходит Резервным Победителям, которые определяются согласно п.п. 11.3.–11.3.1. настоящих Правил.

Участник, которому перешло право на получение Приза, признается Резервным Победителем и уведомляется согласно Таблице № 7, посредством отправки уведомления на адрес электронной почты, указанный в личном кабинете при регистрации, а также звонком по номеру телефона, указанному Участником на Интернет-сайте.

**Таблица № 7**

| № розыгрыша | Резервные Победители Рекламной игры извещаются о выигрыше не позднее |
|---|---|
| Розыгрыш № 1 | 14.10.2020 года |
| Розыгрыш № 2 | 26.10.2020 года |
| Розыгрыш № 3 | 16.11.2020 года |
| Розыгрыш № 4 | 16.11.2020 года |

Участник, ставший Резервным Победителем, должен приехать в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Будславская, д. 2, офис 11 для получения Призов 1–7 не позднее сроков, указанных в Таблице № 8.

**Таблица № 8**

| № розыгрыша | № Приз | Дата выдачи Призов с … по … |
|---|---|---|
| Розыгрыш № 1 | Приз 1-2 | с 14.10.2020 по 21.10.2020 с 12 до 17.00 в будние дни либо в субботу, 17.10.2020 г., с 10.00 до 13.00 |
| Розыгрыш № 2 | Приз 3-4 | с 26.10.2020 по 09.11.2020 с 12 до 17.00 в будние дни либо в субботу, 31.10.2020 г., с 10.00 до 13.00 |
| Розыгрыш № 3 | Приз 5-6 | с 16.11.2020 по 26.11.2020 с 12 до 17.00 в будние дни либо в субботу, 21.11.2020 г., с 10.00 до 13.00 |
| Розыгрыш № 4 | Приз 7 | с 16.11.2020 по 26.11.2020 с 12 до 17.00 в будние дни либо в субботу, 21.11.2020 г., с 10.00 до 13.00 |

Победителю необходимо иметь с собой паспорт гражданина Республики Беларусь (или вид на жительство), национальный паспорт той страны, гражданином которой он является, или документ, подтверждающий личность (для лиц без гражданства).

В случае если Участник, которому перешло право на получение приза, не выполнит действия в обозначенный срок, он утрачивает право на получение приза. Приз остается в распоряжении Организатора.

**12.7.** В случае если Участник в период с 10.08.2020 г. по 11.10.2020 включительно осуществил возврат товара надлежащего качества, при покупке которого ему были присвоены Игровые Коды, данные коды у такого Участника аннулируются. Аннулирование осуществляется путем пересчета суммы чека с учетом возврата и вычисления, оставшихся для участия в розыгрыше кодов согласно п. 10.1. и п. 10.4. Излишне присвоенные Игровые Коды аннулируются с конца пула Игровых Кодов, первоначально присвоенного за игровой чек (пул кодов – совокупность Игровых Кодов, присвоенных за игровой чек). В случае, если аннулированный Игровой Код стал выигрышным кодом, право на соответствующий Приз по аннулированному Игровому Коду переходит соответствующему Резервному Победителю, который определяется согласно пп. 11.3.–11.3.1. настоящих Правил.

**12.8.** Организатор не оплачивает Участникам Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения призов.

**12.9.** Победитель при получении Приза в офисе Организатора письменно подтверждает факт его получения, заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором, связанные с получением Приза.

**12.10.** Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих призов.

**12.11.** Организатор Рекламной игры не несет ответственность за любые риски, связанные с повреждением призов и их эксплуатацией, возникшие после передачи Победителям.

**13. Комиссия по проведению Рекламной игры.**

Для контроля за соблюдением официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

1. Прыгунова Ольга Юрьевна, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА»;
2. Костюк Дарья Валерьевна, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА»;
3. Ананич Михаил Михайлович, заместитель директора ООО «АМК «РЭПКА»;
4. Юшковский Алексей Анатольевич, Индивидуальный предприниматель;
5. Жигимонт Андрей Владимирович, Индивидуальный предприниматель.

**14. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.**

**14.1.** Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

**14.2.** Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок не позднее 22.11.2020 г.

**14.3.** Имена Победителей Рекламной игры будут размещены на Интернет-сайте: www.promo-gpn.by.

**14.4.** Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Интернет-сайте, а также по номеру телефона горячей линии: +375 17 239 06 09 круглосуточно без обеда и выходных дней.

**15. Прочие условия.**

**15.1.** Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами, и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

**15.2.** Факт участия в Рекламной игре означает, что ее участники соглашаются принимать участие в видеосъемке, что их фамилии, имена, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

**15.3.** Организатор не несет ответственность за работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет участнику), операторов сотовой и подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т.д.) и почтовой службы (сроки доставки и т. д.).

**15.4.** Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, представленной Участником.

**15.5.** Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке, согласно законодательству РБ.

**15.6.** Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, ул. Будславская, д. 2, офис 11.

Свидетельство № 3831 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 3 августа 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

# НАЙНОЎШЫЯ РАСПРАЦОЎКІ — МОЛАДЗІ

**Беларускія вучоныя не толькі займаюцца навуковымі даследаваннямі, але і ўдзяляюць шмат увагі папулярызацыі новых ведаў.**

Адны з першых пра дасягненні беларускай навукі даведваюцца студэнты. Выкладчыкі адразу дзеляцца з імі ў вучэбных аўдыторыях. Але і школьнікі не застаюцца ўбаку — навуковыя адкрыцці прадстаўлены ў вучэбнай літаратуры, пра іх можна пачытаць у інтэрнэце.

## ПАДАРУНКІ АМАТАРАМ ГІСТОРЫІ

У 2017 годзе ў топ дасягненняў Нацыянальнай акадэміі навук увайшлі адкрыцці, зробленыя вучонымі Інстытута гісторыі на поўдні Беларусі (знойдзены самыя старажытныя матэрыялы, звязаныя з жыццём славян, што датуюцца IV стагоддзем нашай эры). Цяпер гэтая інфармацыя ўжо прадстаўлена ў новай вучэбнай літаратуры.

Выйшлі чатыры тамы «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці», а пяты знаходзіцца ў выдавецтве. І зноў напрацоўкі, якія прадстаўлены ў гэтых найноўшых працах, кладуцца ў падручнікі, у навучальных установах чытаецца новы курс, ствараецца вучэбны дапаможнік па гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

Яшчэ адна знакавая праца, падрыхтаваная вучонымі Інстытута гісторыі ў супрацоўніцтве з выкладчыкамі ВНУ, — «Вялікі гістарычны атлас Беларусі», таксама можа выкарыстоўвацца на занятках са школьнікамі і студэнтамі.

За 2016–2020 гады супрацоўнікамі Інстытута гісторыі падрыхтавана 13 вучэбных і метадычных выданняў для ўстаноў адукацыі нашай краіны, цэлы комплекс выданняў, дзе разглядаецца перыяд Другой сусветнай вайны. Сярод іх кніга «Унёсак беларускага народа ў Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне». На яе ёсць пастаянны попыт, сёлета пабачыла свет трэцяе выданне. Дзякуючы працы «Сузор'е герояў зямлі беларускай» хлопцы і дзяўчаты могуць даведацца, што каля пяцісот ураджэнцаў нашай зямлі атрымалі званне Герояў Савецкага Саюза, іх біяграфіі ўпершыню сабраны пад адной вокладкай.

Таксама вучонымі Інстытута гісторыі падрыхтаваны цэлы вучэбна-метадычны комплекс (падручнік, дапаможнікі, атласы, карты) для сёмага класа па гісторыі Беларусі, які знаёміць школьнікаў з падзеямі, што адбываліся на нашай зямлі ў XVI—XVIII стагоддзях.

Ужо выйшлі чатыры тамы грунтоўнай працы, якая знаёміць моладзь з сучасным жыццём краіны, — «Рэспубліка Беларусь. 25 гадоў стварэння і здзяйснення». У выданні было задзейнічана больш за 300 аўтараў.

Выдадзены шматтомныя працы нашых класікаў. Некалькі пакаленняў вучоных шчыравала над стварэннем 37 тамоў Гістарычнага слоўніка.




«Усе нашы выданні, што ствараюцца разам вучонымі з Акадэміі навук і вядучых навучальных устаноў, — тая фундаментальная аснова, на якой развіваецца вучэбна-выхаваўчы працэс у школах і ВНУ. На перадавых пазіцыях рыхтуюцца курсы, спецкурсы, вучэбныя дапаможнікі», — адзначыў **акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ.** Ён звярнуў увагу на тое, што сёння важна рупіцца пра падрыхтоўку настаўнікаў, знаёміць іх з перадавымі напрацоўкамі, каб педагогі, у сваю чаргу, маглі даносіць высакаякасныя веды будучым спецыялістам: хімікам, гісторыкам, літаратарам, мовазнаўцам, эканамістам, гісторыкам і г. д.

Падручнікі абнаўляюцца раз на пяць гадоў, і ў іх могуць змяшчацца спасылкі на новую літаратуру, падрыхтаваную вучонымі. Каб больш аператыўна даносіць інфармацыю да педагогаў, даследчыкі накіроўваюць у Мінадукацыі аналітычныя запіскі, выступаюць з артыкуламі ў часопісах. Педагогам, якія цікавяцца напрацоўкамі беларускіх навукоўцаў, варта часцей заходзіць на сайт Акадэміі навук і знаёміцца з навінкамі на старонках інстытутаў.

## КРЭАТЫЎНАЕ МЫСЛЕННЕ

Для таго каб наша сістэма адукацыі адпавядала міжнародным патрабаванням, была канкурэнтаздольная, задавальняла сучасныя патрэбы, нам неабходныя адукацыйныя стандарты, вучэбныя праграмы, разнастайныя дапаможнікі, метадычкі для настаўнікаў, дыягнастычныя, кантрольна-вымяральныя матэрыялы, новыя метады, тэхналогіі, сродкі навучання. Усімі гэтымі распрацоўкамі ўстановы дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі забяспечвае Нацыянальны інстытут адукацыі.

«Для распрацоўкі навуковых прадуктаў мы прыцягваем вядучых спецыялістаў з розных устаноў нашай краіны. Гэта не толькі супрацоўнікі нашага інстытута, але і вядучыя навукоўцы з розных ВНУ: Белдзяржуніверсітэта, БДПУ, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта; вучоныя інстытутаў Нацыянальнай акадэміі навук, спецыялісты Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, а таксама вопытныя педагогі-практыкі. Вынікі нашых навуковых распрацовак знаходзяць адлюстраванне ў сучасных вучэбных дапаможніках», — адзначыла **намеснік дырэктара па навукова-даследчыцкай рабоце Нацыянальнага інстытута адукацыі Мінадукацыі Вольга ЗЕЛЯНКО.** Па ўсіх вучэбных прадметах выдадзены практычныя дыягнастычныя матэрыялы, якія накіраваны на фарміраванне прадметных, метапрадметных і асобасных адукацыйных вынікаў. Дзякуючы такім матэрыялам у адукацыйную практыку ўкараняюцца практыка-арыентаваныя заданні. Усё гэта робіцца для таго, каб дзеці вучыліся выкарыстоўваць сфарміраваныя веды, уменні ў самых разнастайных, у тым ліку нестандартных, жыццёвых сітуацыях, каб яны развіваліся як асобы, былі здольныя крытычна ўспрымаць, ацэньваць, аналізаваць, інтэрпрэтаваць інфармацыю.

## ТЭХНАЛОГІІ Ў ДАПАМОГУ

Новыя тэхналогіі паступова мяняюць адукацыйны працэс. А каранавірус прымусіў выкладчыкаў удзяляць больш увагі менавіта рабоце ў анлайн-фармаце. Беларускія вышэйшыя навучальныя ўстановы змаглі перастроіцца і праводзілі аддалена не толькі заняткі, але і канферэнцыі і іншыя анлайн-мерапрыемствы.

Студэнты педуніверсітэта пад кіраўніцтвам сваіх выкладчыкаў нават запісвалі відэа-ўрокі ў дапамогу настаўнікам, непасрэдна звязаныя з тэмамі, якія дзеці праходзяць у чацвёртай чвэрці.

Падчас пандэміі запатрабаваны быў праект «Педагагічная майстэрня анлайн-навучання», дзе выкладчыкі маглі атрымаць дапамогу па пытаннях укаранення ў вучэбны працэс дыстанцыйнага навучання.

Пры гістарычным факультэце БДУ дзейнічае школа юнага гісторыка, арыентаваная на школьнікаў, яе заняткі запісаны і выкладзены на ютуб-канале. **Дэкан гістарычнага факультэта БДУ Аляксандр КАХАНОЎСКІ** паведаміў, што выкладчыкі разам са студэнтамі працуюць таксама над базай даных па тых, хто загінуў у вайне.

Дасягненні ўніверсітэцкіх вучоных знаходзяць адлюстраванне на інфармацыйным партале БДУ. У электроннай бібліятэцы альма-матар студэнты ў адкрытым доступе могуць знайсці разнастайныя выданні, артыкулы, манаграфіі. Наведваць сайт універсітэта могуць і тыя хлопцы і дзяўчаты, што цікавяцца навукай, але пакуль яшчэ вучацца ў школе. Сёлета ў БДУ ўпершыню пачынае працаваць «Летні ўніверсітэт». Да бясплатных анлайн- заняткаў, падрыхтаваных універсітэцкімі выкладчыкамі, могуць далучыцца студэнты розных вышэйшых навучальных устаноў, а таксама школьнікі.

Філалагічны факультэт БДУ запусціў унікальны праект, варты пераймання калегамі з іншых навучальных устаноў. Тут адкрыта аўдыторыя «Народныя песеннікі і паэты Беларусі», дзе на стэндах размешчана змястоўная інфармацыя пра нашых класікаў, да таго ж кожны стэнд мае QR-коды, пры дапамозе якіх будучыя філолагі выходзяць на спецыяльны сайт, на якім можна атрымаць дадатковыя веды, заданні.

Сёння студэнты могуць набываць веды не толькі падчас удзелу ў традыцыйных лекцыях, семінарах, падрыхтоўцы да іспытаў, але і ў пошуку — хлопцы і дзяўчаты самі здабываюць інфармацыю, аналізуюць, параўноўваюць розныя пункты гледжання і выдаюць уласныя адукацыйныя прадукт.

Белдзяржуніверсітэт актыўна збірае і прапагандуе ідэі, звязаныя з трансфармацыяй навучання. Створаны партал, які аб'ядноўвае выкладчыкаў розных ВНУ, — «Метадалогія, змест, практыка крэатыўнай адукацыі» — гэта своеасаблівая адкрытая пляцоўка для дыскусій. Тут размяшчаюцца лекцыі, відэаматэрыялы, адкрытыя заняткі і іншыя напрацоўкі. Ладзяцца семінары, удзельнікі якіх ствараюць адукацыйныя прадукты. Ужо з'явілася каля 500 метадычных распрацовак, што выкарыстоўваюцца падчас вучэбнага працэсу.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Меркаванне

# «СІСТЭМУ АДУКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ ЛІЧУ АДНЫМ З ГАЛОЎНЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ...»

**Ірына КІТУРКА, рэктар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы:**



— Асабліва значныя крокі ў развіцці сістэмы адукацыі зроблены за апошнія гады. Падтрымка з боку дзяржавы адчуваецца на ўсіх узроўнях — як рэспубліканскім, так і мясцовым. Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы ўзяў стратэгічны курс на лічбавыя тэхналогіі і пазіцыяніруе сябе як «Лічбавы ўніверсітэт+». Сёлета адкрыты набор на некалькі вельмі запатрабаваных спецыяльнасцяў, такіх як «Прамысловыя робаты і робататэхнічныя комплексы», «Штучны інтэлект», «Дызайн віртуальнага асяроддзя». Навацыяй гэтага года стала стварэнне лічбавай прыёмнай камісіі, дзе ўсе этапы — ад падачы дакументаў да залічэння студэнтаў — прадстаўлены ў электронным выглядзе.

Высокія дасягненні дазволілі Купалаўскаму ўніверсітэту стаць першай рэгіянальнай ВНУ, уключанай у рэспубліканскі праект «Універсітэт 3.0», у якім спалучаюцца тры важныя кірункі — адукацыя, навука і камерцыя. Рэалізаваць задачы дапамагае навукова-тэхналагічны парк, адкрыты пры маштабнай падтрымцы аблвыканкама. За кошт сродкаў абласнога інавацыйнага фонду будуецца і хутка ўступіць у дзеянне другая чарга. Інфраструктура ўніверсітэта дае студэнтам магчымасць ствараць уласны бізнес. Адкрылі студыю праектаў і стартапаў, праводзім конкурс «Інастарт». Пераможцы конкурсу атрымліваюць значную фінансавую падтрымку для рэалізацыі сваіх праектаў за кошт сродкаў фонду інавацыйнага развіцця, што з'явіўся летась ва ўніверсітэце. Студэнты бачаць магчымасці, створаныя для іх. На прыкладзе ўніверсітэта можна сцвярджаць, што нашы студэнты заканчваюць адукацыю з працоўнай кніжкай на руках. Даём ім магчымасць працаваць па сваёй спецыяльнасці паралельна з вучобай.

Пра якасць беларускай сістэмы адукацыі сведчыць пастаянны рост колькасці замежных студэнтаў. У нашы ВНУ едуць на вучобу грамадзяне многіх краін свету. За апошнія пяць гадоў іх колькасць у ГрДУ імя Я. Купалы ўзрасла ўдвая.

Вялікая ўвага ўдзяляецца ўмовам пражывання студэнтаў. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы ў нас узводзіцца камфартабельны 13-павярховы інтэрнат, які будзе здадзены сёлета.

Я хачу сказаць тое, што заўсёды кажу студэнтам. У англійскай мове ёсць стандартнае пытанне: «How are you?» і ёсць стандартны адказ: «I'm fine» — у мяне ўсё добра. Таму што калі ў цябе нешта кепска, паўстае наступнае пытанне: што ты зрабіў для таго, каб палепшыць сваё жыццё? Атрымаў адукацыю, набыў новыя кампетэнцыі? Без працы, як вядома, нічога не даецца.

Апошнім часам на адпаведных сайтах, у тэлеграм-каналах з'яўляецца нямала негатыву. Хочацца запытаць: а чаму ж не адзначаюцца поспехі? Не ў кожнай краіне сёння ёсць бясплатная адукацыя. Хто хоча прыкласці намаганні, хто хоча зарабіць, рэалізаваць сябе, можа гэта зрабіць у нашай краіне. Мы дапамагаем працаўладкавацца і тым, хто вучыўся на платнай аснове. Шкада, што некаторыя засяроджваюцца толькі на негатыве, а вось дасягненні часам свядома замоўчваюцца. А яны відавочныя. Мы бачым, якімі сталі нашы гарады, дарогі. І гэтым мы выгадна адрозніваемся ад многіх краін. Прыемна бачыць, што наша Беларусь становіцца падамшняму ўтульнай краінай.

**Запісала Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Нефармат



# ЯК НЕ СТАЦЬ ХАТНЯЙ РАБОТНІЦАЙ

**Нездарма вопытныя разведчыкі кажуць: слухай уважліва чалавека, і ён усё пра сябе раскажа. Так і з героямі інтэрв'ю часам бывае. Здаецца, раскажа чалавек пра свае працоўныя дасягненні, пра адносіны да справы і людзей, яшчэ трошкі пра асабістае, пра сям'ю — ніякіх нечаканасцяў. І раптам прарываецца маленькая дэталь, якая з галавой выдае адносіны сучасніка да той ці іншай праблемы, скажам, да гендарнага пытання.**

Вось і нядаўна ў адной з раённых газет зачапілася вокам за цікавы праект, у ім аўтар распытвае розных людзей пра іх жыццё і работу. Дык вось адзін з герояў ахвотна распавядае, як рухаецца па службовых прыступках. Ну і сямейныя адносіны не абышоў, пахваліўся: жонка хоць і вырасла ў горадзе, але ўмее пятрушку пасадзіць з гуркамі, агарод у яе дагледжаны, у доме нагатавана і напрасавана, чысцінёй ззяе. Далей — болей, на рабоце паспявае, дома ўсё робіць, і пры гэтым не ператвараецца ў хатнюю работніцу.

Што і казаць, ідэал жанчыны, закладзены ў мужчынскай свядомасці яшчэ з савецкіх часоў: працаўніца, гаспадыня, маці — павінна паспяваць ўсё і ўсюды, дамашняя гаспадарка ў яе ўзорная, дзеці-выдатнікі, муж смачна накормлены, штодня ў свежай кашулі. А выраз «не ператвараецца пры гэтым у хатнюю работніцу» азначае, трэба думаць, што тая няўрымслівая працаўніца-гаспадыня за сабой сочыць, умудраецца добра выглядаць, трымае форму і ўсмешку на твары.

Нехта скажа, вой, так жыве большасць нашых кабет, а раней іхнія маці жылі. Дык цяпер куды лягчэй, шмат бытавой тэхнікі жанчыне ў дапамогу. І адрозненне ранейшай гаспадыні ад сучаснай у тым, што першая з агарода адразу да начовак з бялізнай бегла, каб рукі адмоклі, а цяперашняя — машыну пральную ўключыла ды проста ў манікюрны салон пакрочыла. Яно так, калі без фанатызму, з узаемаразуменнем, маральнай падтрымкай усёй сям'і, фізічнай дапамогай хоць бы ў некаторых сітуацыях, відаць, можна быць гаспадыняй у доме.

Але некаторых падводзіць той самы фанатызм. Шмат гадоў таму мне даводзілася сустракацца з адной жыхаркай райцэнтра, якая працавала суддзёй. Не вам казаць, якая гэта фігура для маленькага гарадка. Пра яе строгасць, справядлівасць і непадкупнасць легенды хадзілі. Былі і жарты накшталт таго, што хутка адна палова жыхароў будзе сядзець, другая сухары сушыць. Але ж яна з юнацтва была чалавекам мэтанакіраваным, ставіла перад сабой задачы, вырашала іх. І лічыла, што павінна быць узорам ва ўсім, у тым ліку ў асабістым жыцці. Дык вось, нармальным для сябе маладая мілавідная жанчына лічыла пры яе рабоце трымаць дачны ўчастак, яго апрацоўваць. Потым, прыйшоўшы з агарода, праверыць урокі, пакласці дзяцей спаць, затым прыбраць, памыць падлогу, згатаваць нешта для сям'і назаўтра, а ў дзве гадзіны ночы, бо іншага часу не было, сядала за ўласны манікюр. Усе навакольныя лічылі і сям'ю і іх лад жыцця ўзорна-паказальным. Ну там сапраўды не было да чаго прыдрацца. Ці толькі падавалася?

Усё гэта працягвалася гадамі. А потым муж яе пакінуў. Ну, так бывае часам з узорнымі жонкамі... Яна трымалася, выгляду не паказвала, лічыла, што не мае права на эмоцыі. Яна ж «жалезная лэдзі». Ды праз год-другі звольнілася з работы, перабралася ў сталіцу. Спадзяюся, што тады, на рубяжы развалу былой вялікай краіны, яна нейкім чынам знайшла прымяненне сваім грунтоўным ведам у галіне юрыспрудэнцыі, а можа, і стаўленне да жыцця перагледзела.

Варта сказаць, што ўзорных гаспадынь мне даводзілася сустракаць нямала, а вось шчаслівых з іх, каб прыгадаць, трэба яшчэ падумаць. Траплялся, праўда, шчаслівыя, не надта ўзорныя. Адна такая ў канцы 90-х працавала намеснікам дырэктара сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы, гадавала трох дзяцей. Заўсёды элегантная, з прычоскай, з макіяжам, праўда, дома ў яе часта бывае вэрхал. Але сама па жыцці аптыміст, з усмешкай казала, што жыццё — гэта выбар. Таму яна выбірае работу і знешні выгляд, бо нельга ж ахапіць усё. Дзеці выраслі, зараз з мужам яны сядзяць на пенсіі, перыядычна наведваюць сыноў і нявестак. А ў кватэры ў яе цяпер поўны парадак, яна жартуе, што генеральную ўборку робіць раз у трыццаць гадоў: усё выкідвае аж да сцен і ставіць новае.

Нехта скажа, што цяпер іншая праблема, наадварот, маладыя гаспадыні часам нічога рабіць не хочуць, праз гэта разводы здараюцца. Бывае, не буду спрачацца, але гэта, як той казаў, зусім іншая гісторыя. Зараз я пра тое, як знайсці баланс паміж працаўніцай і хатняй работніцай, каб не ператварацца ў апошнюю. Дзе той правільны баланс, я не ведаю, можа вы знаеце?

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.33 | 20.57 | 15.24 |
| Віцебск — | 5.17 | 20.52 | 15.35 |
| Магілёў — | 5.23 | 20.47 | 15.24 |
| Гомель — | 5.25 | 20.38 | 15.13 |
| Гродна — | 5.49 | 21.12 | 15.23 |
| Брэст — | 5.55 | 21.06 | 15.11 |

## Месяц

*Поўня 3 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

*Пр.* Хрысціны, Барыса, Георгія, Глеба, Мікалая, Рамана.
*К.* ПРААБРАЖЭННЕ ГАСПОДНЯЕ. Славаміра, Якуба.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 6 ЖНІЎНЯ

**У краіне**

**1715** год — нарадзіўся (Лідскі павет) Мацей Догель, гісторык-архівіст, прававеда. Яго зборнікі матэрыялаў па гісторыі міжнародных адносін Польшчы, Літвы і Беларусі XIII—XVIII стагоддзяў як гістарычныя крыніцы не страцілі свайго значэння і цяпер.



**1840** год — нарадзіўся Альгерд Рышардавіч Абуховіч, беларускі пісьменнік. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі. Падарожнічаў, жыў у Жэневе, Парыжы. Разам з Францішкам Багушэвічам родапачынальнік жанру байкі ў беларускай літаратуры. Аўтар баек «Старшына», «Суд», «Воўк і лісіца» і іншых. Перакладаў творы А. Пушкіна, М. Лермантава, У. Сыракомлі. Ф. Шылера, Д. Байрана.

**1895** год — нарадзіўся Казімір Феліксавіч Мірон, беларускі вучоны ў галіне лесазнаўства, прафесар, заслужаны лесавод Беларусі.

**1920** год — нарадзіўся (цяперашні Віцебскі раён) Рыгор Саламонавіч Гарфункін, Герой Савецкага Саюза (1944).

**1925** год — ЦК РКП(б) пагадзіўся з прапановай беларускіх камуністаў аб рэарганізацыі саўпартшколы Беларусі ў Камуністычны ўніверсітэт імя У. І. Леніна (у 1932-м рэарганізаваны ў Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу, а яго газетнае аддзяленне — у Камуністычны інстытут журналістыкі).

**1930** год — нарадзіўся Віктар Аўгуставіч Іонас, беларускі вучоны ў галіне аграхіміі, кандыдат сельскагаспадарчых навук. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1940** год — нарадзілася Ларыса Рыгораўна Герлаван, беларускі мастак тэатра.

**1950** год — нарадзіўся Мікалай Іванавіч Кароткі, беларускі трэнер (гандбол), заслужаны трэнер Беларусі.

**1965** год — нарадзіўся Юрый Віктаравіч Камароў, беларускі спартсмен (бодзібілдынг, дзюдо, паўэрліфтынг), майстар спорту СССР па дзюдо, паўэрліфтынгу, бодзібілдынгу.

**У свеце**

**1905** год — у Расіі быў выдадзены царскі Маніфест аб заснаванні Дзяржаўнай думы — першай прадстаўнічай заканадаўчай установы Расіі.

**1910** год — нарадзіўся Мікалай Паўлавіч Будашкін, расійскі кампазітар, педагог, народны артыст РСФСР.

**1915** год — нарадзіўся Валянцін Сяргеевіч Левашоў, расійскі кампазітар, харавы дырыжор, народны артыст СССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расіі.



**1940** год — нарадзілася Любоў Васілеўна Стрыжэнава, расійская актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Расійскай Федэрацыі.

**1985** год — на 16-й сесіі Паўднёваціхаакіянскага форуму ўхвалены Дагавор аб абвяшчэнні паўднёвай часткі Ціхага акіяна бяз'ядзернай зонай (Дагавор Раратонга).

**Так гаварыў...**

**ТОМАС МАКАЛЕЙ:**

*«Маленькі добры ўчынак лепшы, чым самыя ўрачыстыя абяцанні зрабіць немагчымае».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Ты, вядома, ніколі не ажэнішся з дзяўчынай дзеля грошай, праўда?

— Вядома. Але, з іншага боку, нядобра, каб яна засталася старой паннай праз тое, што ў яе ёсць грошы.

**Урач хуткай дапамогі прыязджае да бабулькі, якая, здаецца, збіраецца паміраць. Бабуля зусім слабым голасам кажа:**

**— Доктар, вы жанаты чалавек?**

**— Не.**

**Бабуля рэзка падскоквае, энергічна садзіцца ды бадзёрым голасам крычыць мужу:**

**— Васіль, хутка прынясі доктару кавы!**

**І тут жа ўрачу:**

**— Доктар, вось што я вам скажу: у мяне ёсць пляменніца...**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2533.

Нумар падпісаны ў 19.30 5 жніўня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12